Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 32 (3406)
НЯДЗЕЛЯ
9
ЛЮТАГА
1936 г.
Год выдання XIX

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

АБ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЙ РАБОЦЕ Ў ВЁСЦЫ—ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б.

ЗАКЛЮЧНАЯ ПРАМОВА СТАРШЫНІ СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР т. Н. М. ГАЛАДЗЕДА НА III СЕСІІ ЦВК БССР XI СКЛІКАННЯ.

III СЕСІЯ ЦВК БССР XI СКЛІКАННЯ: ПРАМОВЫ тт. С. Я. ВАЛЬФСОНА, Н. В. СЯРОЖКІНА, З. Д. НЕЙШТАТА, М. А. ГУРЫНОВІЧА, С. М. СЫМАНА, Е. І. ГЛАДЫШАВА, К. А. РУБЕНА.

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — ПЛАН РОСТУ І РОСКВІТУ.

ПАКОНЧЫЦЬ З АДСТАВАННЕМ ЗАГАТОВАК І ВЫВАЗКІ ЛЕСУ.

ПІСЬМЕННІКІ СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ — ЯНКА КУПАЛА.

ЗА РУБЯЖОМ:

ПАВЕДАМЛЕННІ АБ ПАСЫЛЦЫ ЯПОНА-МАНЧЖУРСКІХ ВОЙСК Ў ГРАНІЦАМ МНР.

ІНТРЫГІ АЎСТРЫЙСКІХ МАНАРХІСТАЎ.

АНГЛІЙСКАЯ ГАЗЕТА АБ ВЫМЫСЛАХ ЯПОНСКАГА ДРУКУ.

СТАЧКА КРАЎЦОЎ Ў ВАРШАВІ.

ПЛАН РОСТУ І РОСКВІТУ

Гэтымі днямі закончыла сваю работу 3-я сесія ЦВК БССР XI склікання. Сесія падвяла вынікі мінулагоднай рабоце і намеціла план новага года, чацвертага года другой соцыялістычнай пяцігодкі. Гэты план распрацаваны на аснове пастаноў 2-й сесіі ЦВК СССР, якая склала і зацвердзіла агульную праграму работ для ўсяго Совецкага Саюза на 1936 год.

Падведзены знамянальны вынікі, складзена захапляючая сваёй грандыёзнасцю і веліччу праграма. З года ў год, дзякуючы правільнаму правядзенню ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, дзякуючы дапамозе пролетарыята Совецкага Саюза, расквітае Совецкая Беларусь. Комуністычная партыя, наш родны і вялікі Сталін вядуць нашу краіну, як і ўвесь Совецкі Саюз, ад адной да другой перамогі.

Соцыялізм, аб чым вякамі марылі мільёны забітых і прыгнечаных, соцыялізм, аб якім марылі, за які змагаліся як за светлую, радасную і шчаслівую будучыню, стаў рэальнасцю, стаў фактам сённяшняга дня.

На першай усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў вялікі правадыр народаў таварыш Сталін гаварыў:

«Характэрная асаблівасць нашай рэволюцыі заключаецца ў тым, што яна дала народу не толькі свабоду, але і матэрыяльныя багацці, але і магчымасць заможнага і культурнага жыцця». Іменна гэта зрабіла наш совецкі народ самым радасным і шчаслівым у свеце. «Жыць стала лепш, таварышы, — гаварыў на той-жа нарадзе наш настаўнік таварыш Сталін. — Жыць стала весялей. А калі весела жывецца, работа спорыцца».

Іменна адсюль, з гэтых сталінскіх указанняў і выходзіла сесія, зацвярджаючы план 1936 года. Стаханаўскія папраўкі, унесеныя ў мінулым годзе, улічаны зараз. Выбраннікі народу, члены сесіі гаварылі аб вялікім энтузіязме прапоўных, гаварылі аб пафасе асваення тэхнікі і ўсіх багаццяў нашай краіны. Члены сесіі гаварылі аб вялікай любві ўсяго народу да роднага і вялікага Сталіна, які штодня клапоціцца аб жыцці народаў, намячае яго шляхі і задачы.

Сесія зацвердзіла велізарную праграму работ новага, стаханаўскага года.

На 24 процанты павышаецца аб'ём валавой прадукцыі прамысловасці БССР, на 16,9 процантаў намечана павышэнне прадукцыйнасці працы, на 6 процантаў намечана зніжэнне сабекошту. Сярэднегадовая зарплата на аднаго рабочага па прамысловасці Наркаммясцпрома Беларусі павінна быць павышана на 8,8 проц.

Ці ёсць яшчэ дзе за мяжой такая краіна, якая можа пахваліцца падобнымі лічбамі? Такой другой краіны ў капіталістычным свеце няма. Капіталістычны свет знаходзіцца ў стане дэпрэсіі асобага роду, дэпрэсіі, якая адбываецца пры агульным крызісе капіталізма. Там расце руйнаванне, беспрацоўе, голад і збяднение працоўных мас.

34 мільёны рублёў сёлета ўкладваецца ў будаўніцтва аршанскага ільнокамбіната. Наша Совецкая Беларусь будзе не толькі вырошчваць лепшы лён, але і выпрацоўваць лепшы ільнотканіны. На змену векапомным адсталым пралкам, дапатопным ткацкім варштатам і даматканаму шэраму, грубаму палатну прышла новая машынная высокая тэхніка, а за ёю і белае, тонкае палатно.

Ворагі беларускага народу — контррэволюцыйныя нацыянал-дэмакраты — прабавалі павесці нашу краіну назад к хутарам, к прымітыўнай тэхніцы, да калоніі польскага і нямецкага імперыялізма.

Партыя большэвікоў, яе правадыры Ленін і Сталін вывелі беларускі народ да соцыялізма. Совецкая Беларусь пышным цветам цвіце ў Саюзе Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

У план 1936 года ўключана будаўніцтва другой чаргі 1-й Беларускай дзяржаўнай раённай электрастанцыі імя Сталіна, пашырэнне фабрыкі «Дзвіна» імя Кагановіча, пашырэнне магілёўскай шаўковай фабрыкі, будаўніцтва рагачоўскага кансерва-малочнага завода.

Намечаны велізарныя капіталаўкладанні ў народную гаспадарку БССР у 1936 годзе. 339,08 мільёна рублёў будзе выдаткавана на новае будаўніцтва і абсталяванне.

Сесія ЦВК сур'ёзныя задачы вызначыла і перад сельскай гаспадаркай. Гэтыя задачы выцякаюць з указання таварыша Сталіна — дабіцца 7—8 мільярдаў пудоў зярна за бліжэйшыя тры-чатыры гады, гэтыя задачы выцякаюць з пастановы ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб нячорназёмнай паласе. Ужо на сесіі было заяўлена, што ўрадавы план ураджайнасці з'яўляецца мінімальным. Калгаснікі БССР будуць змагацца за значна павышаныя ўраджаі, якіх яны на аснове разгортвання спаборніцтва, на аснове стаханаўскіх метадаў безумоўна дабіваюцца.

Павысіць ураджай зернавых, бульбы, ільну, пашырыць пасевы кармовых культур, павялічыць пагалоўе жывёлы — такія дырэктывы сесіі.

Расце краіна, становіцца заможней яе народ, і гэта выклікае яшчэ большыя запатрабаванні ў культуры, у асвеце. На 32,5 проц. у параўнанні з мінулым годам павялічваюцца асігнаванні на народную асвету. Будзе расці лік студэнтаў і вучняў. У масавай школе будзе вучыцца больш мільёна чалавек. На 120 проц. павялічваюцца капітальныя ўкладанні на народную асвету. Гэта — небывалыя ні ў адной краіне лічбы.

Яшчэ большыя асігнаванні вызначаюцца на ахову здароўя. Тут рост у параўнанні з мінулым годам дасць 60 проц. Совецкая краіна больш чым якая-небудзь іншая краіна ў свеце клапоціцца аб здароўі сваіх грамадзян.

Совецкая краіна безупынна клапоціцца і аб тым, каб яе народ жыў у найлепшых умовах. 23,5 мільёна рублёў асігнуецца на комунальную гаспадарку. Павелічэнне ў параўнанні з мінулым годам на 40,7 проц. Комунальная гаспадарка, якая займае ў добрабыце прапоўных значнае месца, дасць, бадай, самае большае павелічэнне. Рэканструюцца нашы гарады, узводзяцца новыя светлыя будынкі, разбіваюцца паркі і сады. У такім напрамку акрэсліла развіццё гэтай важнай галіны гаспадаркі 3-я сесія ЦВК БССР.

І гандаль, і транспарт, і сувязь, літаральна па ўсіх галінах гаспадаркі намечаны небывалыя дагэтуль павелічэнні ў росце.

Рашэнні прыняты. Сесія асігнавала на правядзенне намечаных мерапрыемстваў вялікія сумы грошай. Яна зацвердзіла дзяржаўны бюджэт. Справа зараз заключаецца ў тым, каб асігнаванні былі поўнасцю і па-гаспадарску скарыстаны іменна на тыя мерапрыемствы, на якія яны адпушчаны.

Рашэнні прыняты. Гэтыя рашэнні даюць велізарны разгон для творчай работы беларускага прапоўнага народу. Пад кіраўніцтвам КП(б)Б і лепшага сталінца таварыша **Гікало** гэтыя рашэнні будуць выкананы і перавыкананы.

АБ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЙ РАБОЦЕ Ў ВЁСЦЫ

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б

Перамога калгаснага ладу, рост заможнага жыцця калгаснікаў, усё павялічваючаяся цяга ўсёй масы калгаснікаў да ведаў, да павышэння свайго культурнага ўзроўню патрабуюць ад усёй КП(б)Б карэннага паляпшэння справы кіраўніцтва культурна-асветнай работай у вёсцы.

У той час як у калгаснай вёсцы, уступіўшай на шлях заможнага жыцця, адбываецца велізарнага значэння працэс узрастання тэмпаў культурнага росту, гіганцкае павелічэнне імкнення калгаснікаў да культуры, цэлы рад партыйных арганізацый раёнаў аказаліся ў баку ад адной з важнейшых задач партыі — кіраўніцтва культурна-асветнай работай у вёсцы.

Паўнейшую безадказнасць да гэтай важнейшай справы праявіла кіраўніцтва Наркомасветы, які зусім не цікавіўся культурна-асветнай работай у вёсцы. Наркомасветы на працягу раду гадоў не правёў ніводнага мерапрыемства і не паставіў ніводнага пытання па паляпшэнню культурна-асветнай работы ў вёсцы, не правёў ніводнай нарады раённых культасветработнікаў, работнікаў дамоў культуры, хат-чыталень. Ні чым іншым, як безадказнымі адносінамі і палітычнай недаацэнкай гэтага важнейшага ўчастка работы належыць растлумачыць даходзячую да ганьбы цякучасць складу культурна-асветных работнікаў у саміх райана і асабліва ў дамах культуры і хатах-чытальнях, пастаяннае скарыстанне, як правіла, гэтых работнікаў на ўсякіх іншых работах, прызначэнне заг. домам культуры і хатнікам для атрымання толькі бюджэтнай стаўкі з выкананнем работы ў зусім іншай галіне. Зусім нецярпімым з'яўляецца становішча з камплектаваннем кадраў культурна-асветных работнікаў, калі тут на гэтым адказным участку работы нярэдка можна сустрэць выпадковых людзей, зусім няграматных, непадрыхтаваных, а іншы раз проста прахадзімцаў, выгнаных з іншых месц, і антысовецкіх людзей.

Такое становішча прывяло да таго, што цэлы рад дамоў культуры і асабліва хат-чыталень закрыты, памяшканні іх скарыстаны пад канцэлярыі, пад кватэры работнікаў ці рознага роду складачныя памяшканні, шмат існуючых дамоў культуры і хаты-чытальні брудныя, некультурныя, памяшканні іх не адрамантаваны і не абсталяваны.

Велізарнай палітычнай важнасці мерапрыемства, як ліквідацыя няграматнасці і малаграматнасці сярод насельніцтва і забеспячэнне павышэння агульнай адукацыі працоўных ва многіх раёнах, як належыць не арганізавана, няма належнага ўчоту няграматных і малаграматных, адсутнічае кіраўніцтва работай школ дарослых, у рэзультаце — зрывы заняткаў, адсутнасць якога-б там ні было станоўчага эфекту ад іх работы (вялікі адсеў вучняў, велізарная непаспяховасць), а ў радзе месц фактычны развал гэтых школ, хоць яны і лічацца на паперы.

Кіно і асабліва радыё агідным чынам адстаюць ад узросшых задач культурнага абслугоўвання калгаснай вёскі. Зусім недапушчальным з'яўляецца становішча на сёння, калі радыё, гэты моцны правадзнік культуры ў вёсцы і важнейшы сродак палітычнага выхавання, не прасунута ў БССР далей раённага цэнтра, апрача таго, якасць радыёфікацыі знаходзіцца ў зусім нездавальняючым становішчы.

Гурткі мастацкай самадзейнасці (драматычныя, музычныя і інш.), якія прадстаўляюць вялікую культурную сілу ў вёсцы і маюць нямала сапраўдных таленавітых людзей, не атрымліваюць неабходнай дапамогі і кіраўніцтва з боку цэлага раду партарганізацый і совецкіх органаў.

У мэтах рашучага знішчэння недахопаў у кіраўніцтве культурна-асветнай работай у вёсцы, рашучай перабудовы і далейшага рашучага разгортвання гэтай работы, бюро ЦК КП(б)Б **пастанаўляе:**

1. Абавязаць раённыя камітэты партыі на працягу дэкаднага тэрміну распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па рашучаму паляпшэнню культурна-асветнай работы ў вёсцы, абмеркаваўшы гэтыя мерапрыемствы на бюро райкома.

2. Бюро ЦК КП(б)Б патрабуе ад усіх партыйных і совецкіх арганізацый, ад усіх комуністаў і комсамольцаў непасрэднага актыўнага ўдзелу ў культурна-асветнай рабоце ў соўгасах і калгасах, любоўных адносін да калгаснай культурнай установы сяла і ўсямернага заахвочвання ініцыятывы калгасаў і калгаснікаў у справе іх культурнага ўздыму.

3. Даручыць аддзелу культасветработы ЦК КП(б)Б разам з Наркомасветы ў дэкадны тэрмін узмацніць апарат Наркомасветы, які займаецца культасветработай у вёсцы, перабудаваць карэнным чынам кіраўніцтва гэтай галіной работы, зрабіўшы яго жывым і аператыўным, а таксама поўнасцю ўкамплектаваць склад раённых палітасветінспектароў.

4. Даручыць раённым камітэтам партыі ў дэкадны тэрмін праверыць усіх загадчыкаў дамамі культуры, хатамі-чытальнямі, калгаснымі клубамі, адхіліўшы ад работы ў гэтых установах людзей, не адпавядаючых свайму прызначэнню, поўнасцю ўкамплектаваць іх склад зусім падыходзячымі для гэтай надзвычайна адказнай палітычнай работы людзьмі. Забараніць знімаць з работы загадчыкаў установамі палітасветы ў вёсцы (дамы культуры, клубы, хаты-чытальні, бібліятэкі, кіраўнікі гурткоў) без ведама райана, а таксама скарыстанне іх на іншай рабоце.

На працягу месячнага тэрміну праверыць работу кожнай хаты-чытальні, кожнага дома культуры і кожнага клуба ў раёне, пабудаваць работу гэтых устаноў такім чынам, каб яна адпавядала задачам культурнай работы ў даны перыяд.

5. Даручыць райкомам партыі на працягу лютага 1936 г. правесці раённыя канферэнцыі па культурна-асветнай рабоце ў вёсцы, на якіх абмеркаваць справаздачы аб рабоце дамоў культуры, хат-чыталень, гурткоў самадзейнасці, бібліятэк, правёўшы падрыхтоўчую работу па прыцягненню да гэтай справы культурных сіл вёскі.

Практыкаваць правядзенне раённых алімпіяд і конкурсаў на лепшую ў раёне ўстанову палітасветы (дом культуры, бібліятэка, клуб, хата-чытальня, гурткі самадзейнасці, школы дарослых), даючы прэміі лепшым установам і работнікам.

7. Даручыць Соўнаркому на адным з бліжэйшых пасяджэнняў абмеркаваць пытанне аб паляпшэнні матэрыяльных умоў работнікаў устаноў палітасветы ў вёсцы, якія знаходзяцца на бюджэце, а таксама намеціць мерапрыемствы па будаўніцтву дамоў культуры ў раёнах і іх неабходнаму абсталяванню.

8. Надаючы важнае значэнне справе развіцця ў калгасах клубнай работы, якая павінна заключацца ў арганізацыі культурнага правядзення досугу калгаснікаў, павышэнні іх культурнага ўзроўню (работа гурткоў самадзейнасці, чытка мастацкай літаратуры і т. д.), даручыць Соўнаркому распрацаваць практычныя мерапрыемствы па будаўніцтву ў буйных калгасах клубных памяшканняў і іх неабходнаму абсталяванню. Больш дробныя калгасы, дзе няма адпаведных памяшканняў для клубаў, павінны мець чырвоныя куткі.

9. Лічыць неабходным на бліжэйшым пасяджэнні бюро ЦК КП(б)Б спецыяльна абмеркаваць пытанне аб рабоце па навучанню няграматных і малаграматных. Даручыць Соўнаркому распрацаваць праект практычных мерапрыемстваў па рэалізацыі пастановы Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) ад 16 студзеня 1936 г. па гэтаму пытанню, прадставіўшы яго на абмеркаванне бюро ЦК.

10. Даручыць Наркомасветы, райкомам партыі і райвыканкомам арганізаваць для калгаснікаў і рабочых соўгасаў калектыўныя чыткі мастацкіх твораў у школах дарослых, у хатах-чытальнях, у чырвоных кутках, у спецыяльных гурткох на-даму ў калгаснікаў. Да гэтай работы павінны быць прыцягнуты лепшыя настаўнікі, комсамольцы, вучні старшых класаў сярэдніх школ. Арганізаваць у кожным раёне, дзе ёсць настаўнікі, калгасныя гурткі па вывучэнню замежных моў.

11. Даручыць аддзелу культасветработы ЦК КП(б)Б разам з Наркомасветы, ЦСПСБ і Менскім гаркомам партыі арганізаваць сістаматычныя выезды навуковых работнікаў, выкладчыкаў, работнікаў медыцыны, мастацтва, пісьменнікаў і інш. для чыткі навукова-пэпулярных лекцый у калгасах і соўгасах БССР. На працягу зімовага перыяда правесці 5.000 такіх лекцый.

12. Даручыць Соўнаркому абмеркаваць пытанне аб становішчы радыёфікацыі сяла і намеціць практычныя меры па рашучаму разгортванню гэтай справы ў 1936 годзе.

13. Даручыць Наркомасветы ў 1936 годзе арганізаваць не менш 300 новых калгасных бібліятэк, шляхам правядзення збору кніг у гарадах, а таксама прыняць меры па большага завозу кніг у вёску. Шырока разгарнуць перасовачную бібліятэчную работу ў калгасах, усім стацыянарным бібліятэкам як гарадскім, так і сельскім, арганізаваць абслугоўванне перасоўкамі і кніганошамі калгаснікаў.

Бібліятэкі не павінны абмежавацца толькі колам пастаянных чытачоў, іх задачай з'яўляецца прывучэнне да чытання мастацкай літаратуры самых шырокіх калгасных мас.

14. Абавязаць ДВВ на працягу 1-га квартала 1936 г. выдаць масавым тыражом «Чапаеў» Фурманава, «Мать» Горкага, «Поднятая целина» Шолахава, «Цусима» Новікава-Прыбоя, «Как закалялась сталь» Остроўскага, «Железный поток» Серафімовіча, «Я люблю» Аўдзеенкі, вершы Маякоўскага, лепшыя творы беларускіх пісьменнікаў: «Над ракою Арэсай», зборнік апошніх вершаў Купалы, «Дрыгва» Коласа і зборнік апошніх яго вершаў, зборнік апошніх вершаў Александровіча і творы іншых пісьменнікаў БССР.

15. Даручыць Наркомасветы на працягу зімовага перыяда 1936 г. арганізаваць і правесці сіламі тэатраў БССР 100 спектакляў у калгасах і соўгасах, каб абслужыць імі не менш 30 тысяч калгаснікаў і рабочых соўгасаў.

Райкомам партыі і райвыканкомам выявіць лепшых выканаўцаў калгаснай мастацкай самадзейнасці і арганізаваць з іх на працягу зімовага перыяда пастаянна дзеючыя 7—10 па раён харавых гурткоў, 5—7 драматычных гурткоў, 3—5 струнных аркестраў.

16. Абавязаць Наркомасветы і райкомы партыі на працягу зімовага перыяда арганізаваць 25 тысяч вечароў мастацкай самадзейнасці, не менш двух вечароў у кожным калгасе, шырока практыкуючы абмен лепшымі пастаноўкамі паміж калгасамі.

17. Абавязаць Наркомасветы і ДВВ на працягу двух дэкад выдаць масавым тыражом п'есы для калгасных драмгурткоў як беларускіх, так і перакладных. БАКТу завезці ў раёны не менш 400 камплектаў бутафорый (грым, парыкі і інш.) для калгасных драмгурткоў.

18. Даручыць Белдзяржкіно арганізаваць на працягу 1936 года 40 тысяч кінасеансаў з тым, каб даць не менш трох кінасеансаў у кожным калгасе і соўгасе і дабіцца наведвання іх не менш 3 млн. глядачоў, забяспечыўшы паказ лепшых совецкіх карцін. На працягу 1936 года ўстанавіць стацыянарныя гукавыя кіноўстаноўкі ў 21 раённым цэнтрах, не маючых гэтых установак, а таксама 15 гукавых кіноўстановак устанавіць непасрэдна ў калгасах і соўгасах.

19. Бюро ЦК абавязвае райкомы партыі і райвыканкомы, пад адказнасць сакратароў РК КП(б)Б і старшынь РВК, прывесці ў культурны выгляд усе чырвоныя куткі, хаты-чытальні, калгасныя клубы, дамы культуры, безумоўна забяспечыўшы іх апалам, асвятленнем, забяспечыўшы штодзённую бесперабойную іх работу, сурова караючы ўсіх вінаватых у бяздзейнасці культасветустаноў і ў асаблівасці за скарыстанне іх не па прамому прызначэнню. Бюро ЦК лічыць абсалютна няправільным імкненне некаторых партыйных арганізацый ускласці ўсю адказнасць і арганізацыю культасветработы ў вёсцы выключна на штатных культработнікаў. Непасрэдная работа культасветустаноў вёскі з'яўляецца прамым важнейшым абавязкам партыйных і комсамольскіх арганізацый, сельсоветаў і праўленняў калгасаў.

Пакончыць з адставаннем загатовак і вывазак лесу

Выдатны стаханаўскі рух з кожным днём ахапляе ўсё новыя масы прапоўных нашай краіны. На лесазагатоўках, як і ў іншых галінах народнай гаспадаркі, выраслі свае героі соцыялістычнай працы. Лесарубаў **Дыдо, Ільінчыка, Цяслёнка** і іншых ведае ўся БССР. Іх ведаюць як ініцыятараў стаханаўскага руху ў лесе.

Аднак, лесазагатоўчыя арганізацыі Беларусі, у прыватнасці кіраўніцтва трэста «Лесбел» і дырэктары большасці леспрамгасаў, не ўзначалілі выдатнага руху энтузіястаў лесазагатовак і вывазак. Вопыт лепшых людзей лесу да гэтага часу распаўсюджваецца вельмі слаба.

Яркім пацвярджэннем адсутнасці работы з людзьмі, дрэннага кіраўніцтва і няўмелай арганізацыі работы з'яўляюцца вынікі выканання трэстам «Лесбел» плана загатовак і вывазак лесу. На 1 лютага квартальны план па загатоўках выканан на 34,8 проц., а па вывазцы — толькі на 21 проц. Першыя дні лютага не далі паляпшэння. За 5 дзён вывезена 240 тыс. кубаметраў, замест 600 тыс. кубаметраў па плану.

Леспрамгасы Совецкай Беларусі недадалі краіне каля 2 мільёнаў кубаметраў драўніны. Дрэнная работа іх адразу адбілася на нармальнай рабоце фанерных і лесазаводаў. З прычыны адсутнасці сыравіны спыніў работу капаткевіцкі завод «Звязда». Пад пагрозай спынення знаходзіцца барысаўскі завод «Комінтэрн».

Чым-жа тлумачыцца такое ганебнае адставанне леспрамгасаў? Многія кіраўнікі леспрамгасаў імкнуцца вытлумачыць гэта аб'ектыўнымі прычынамі — непагодай, і абсалютна нічога не робяць для таго, каб на справе фарсаваць лесазагатоўкі і, асабліва, лесавывазкі.

Буйнейшы леспрамгас — Асіпавіцкі (дырэктар **Гольдзін**) выканаў квартальны план вывазак на 23,7 проц. Праведзеная стаханаўская пяцідзённка не дала здавальняючых вынікаў. Усё гэта з'яўляецца рэзультатам дрэннай падрыхтоўкі да пяцідзённкі, адсутнасці работы з людзьмі непасрэдна на лесаўчастках, у калгасах.

Чаго варты тлумачэнні тав. Гольдзіна аб «дрэнных кліматычных умовах», калі ў яго пад бокам пры тых-жа ўмовах асобныя калгасы, дзе па-большэвіцку арганізавана работа, план выконваюць на 200 проц. (калгасы імя Гікало, «Рассвет» і інш.).

Выключна дрэнна працуюць у гэтым леспрамгасе трактарная і аўтабаза.

Асіпавіцкі леспрамгас — не выключэнне. Леспрамгасы паўднёвых раёнаў — **Тураўскі, Петрыкоўскі, Жыткавіцкі, Лельчыцкі** і інш. выканалі свае квартальныя планы па вывазцы на 4—6 проц.

Справа гонару лясных работнікаў, партыйных і непартыйных большэвікоў, працуючых на лесазагатоўках і вывазках, выцягнуць гэты ўчастак з прарыву. Раённыя арганізацыі абавязаны аказаць работнікам лесу штодзённую канкрэтную дапамогу.

УСЕСАЮЗНАЯ СТАХАНАЎСКАЯ ДЭКАДА НА ЛЕСАЗАВОДАХ

ЗАВОД ІМЯ МОЛАТАВА.

7 лютага — у другі дзень стаханаўскай дэкады — завод выканаў план на 103,8 проц. Мэблевы цэх выканаў заданне на 121 процант.

У лесацэху ў другі дзень дэкады прасталя ўся першая змена. Другая і трэцяя змены працавалі таксама з вялікай недагрузкай. У рэзультаце лесацэх выканаў план толькі на 54,5 процантаў.

Прастоі ў лесацэху тлумачацца адсутнасцю сыравіны. Белдрэў і Лесдрэў не паклапаціліся, каб забяспечыць завод дастатковай колькасцю лесасыравіны. Зрыў не своечасовую адгрузку уздзенскі леспрамгас.

С. Г.

МАЗЫРСКІ ЗАВОД «ПРОЛЕТАРЫЙ»

МАЗЫР, 8 лютага. **(Па тэлефону ад кар. «Звязды»).**

У першы дзень усесаюзнай стаханаўскай дэкады мазырскі лесазавод «Пролетарый» па асноўнаму лесапільнаму цэху выканаў план на трох рамах замест чатырох на 106 проц.

Рамшчыкі **Пелясаў і Мінер** выканалі зменнае заданне на 153 проц., Табола і Агалец — на 164 проц., Чумак — на 146,9 проц., Леасевіч — на 121 проц.

Р. ФРАЛОЎ.

БАБРУЙСКІ ЛЕСАКАМБІНАТ

БАБРУЙСК, 8 лютага. **(Па тэлефону ад кар. «Звязды»).** 7 лютага — у першы дзень стаханаўскай дэкады — лесакамбінат выканаў сутачны план на 110 проц., у тым ліку па распілоўцы — на 123 проц.

Вядучы лесацэх № 1 выканаў план на 136,4 проц. Вядомы рамшчык тав. **Рушко** выканаў зменнае заданне на 136,4 проц. Лепшыя рамшчыкі **Дабравольскі** — на 150 проц., **Адынцоў** — па 126 проц. У сярэднім у аддзе рамазмену распілавана 90 кубаметраў драўніны замест 68 па норме. Брак прадукцыі зніжаны з 1,36 да 0,76 проц.

Белдрэўны цэх выканаў свой план на 122 проц. Лепшы стахановец-раскройшчык **Книга** выканаў заданне на 226 проц., тарцаўшчыца **Дзяшыніна** — на 219 проц., шліфавальшчык **Конатруш** — на 246 проц., фрэзероўшчык **Мехай** — на 210 проц.

Лесацэх № 2 выканаў план на 114,4 проц., лесацэх № 3 — на 113 проц., стандартны цэх — на 105 проц.

П. ЧЫКУН.

ГАЛІННЫЯ КАНФЕРЭНЦЫІ ПА ПЕРАГЛЯДУ НОРМ

Народны камісарыят мясцовай прамысловасці БССР распрацаваў каляндарны план правядзення галінных канферэнцый па перагляду тэхнічных норм абсталявання і норм выпрацоўкі. У канферэнцыях прымуць удзел дырэктары трэстаў, начальнікі кіраўніцтваў Наркаммясцпрома, дырэктары прадпрыемстваў, начальнікі цэхаў, інжынерна-тэхнічныя работнікі і рабочыя-стаханаўцы.

Першая галінная канферэнцыя склікаецца па сістэме тарфяной прамысловасці 19 лютага ў Менску. У ёй прымуць удзел усе прадпрыемствы Белторфа, торфазаводы Наркаммясцпрома і торфазаводы, падпарадкаваныя горсоветам і РВК.

На працягу сакавіка і красавіка ў розных гарадах БССР адбудуцца галінныя канферэнцыі па скур-абутковай, тэкстыльнай, шчаціна-шчотачнай, шкляной, паліграфічнай, кандзіцерскай, галантарэйнай, дрэваапрацоўчай прамысловасці, па прамысловасці будматэрыялаў і інш.

Народны камісар мясцовай прамысловасці БССР тав. Балцін абавязаў усіх дырэктароў трэстаў і начальнікаў кіраўніцтваў забяспечыць своечасовую падрыхтоўку матэрыялаў да канферэнцый, прыцягнуўшы да гэтай работы інжынерна-тэхнічных работнікаў, стаханаўцаў і навукова-даследчыя інстытуты.

АДКРЫЛАСЯ 3-я СЕСІЯ ЦВК УКРАІНЫ

КІЕЎ, 7 лютага. (БЕЛТА). Сёння ў зале Украінскага Дома Чырвонай арміі адкрылася III сесія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта УССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта тав. **Петроўскі**, адкрываючы сесію, робіць кароткі агляд небывалых поспехаў Украіны ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва і культуры. Калі т. Петроўскі вымаўляе імя найвялікшага чалавека нашай эпохі, пад кіраўніцтвам і па ўказаннях якога Украіна, як і ўсе нацыянальныя рэспублікі бязмежнага Совецкага Саюза, дабілася небывалых у гісторыі дасягненняў і росту добрабыту працоўных мас, усе ўстаюць і доўгай бурнай авацыяй вітаюць любімага правадыра народаў таварыша **Сталіна.**

Тав. Петроўскі падкрэслівае велізарную ролю кіраўнікоў КП(б)У — тт. **Касіора** і **Постышэва** і старшыні Соўнаркома УССР т. **П. П. Любчэнка**, большэвіцкае кіраўніцтва якіх забяспечыла выкананне ўказанняў мудрага і любімага правадыра таварыша **Сталіна** і вывела Украіну ў рады перадавых рэспублік.

З дакладам аб народнагаспадарчым плане УССР на 1936 г. выступіў старшыня Совета Народных Камісараў УССР тав. П. П. **Любчэнка**, спатканы доўгімі апладысментамі.

ПАХАВАННЕ ГЕРОЯЎ-ПАГРАНІЧНІКАЎ

ХАБАРАЎСК, 7 лютага. (БЕЛТА). 2 лютага ў Градэкова былі дастаўлены целы чырвонаармейцаў-пагранічнікаў тт. **Плекотава, Грачова і Кузнецова**, забітых у сутычцы з напаўшым на совецкую тэрыторыю 30 студзеня японска-манчжурскім атрадам. Труны з целамі загінуўшых герояў былі ўстаноўлены ў клубе атрада пагранічнай аховы. На труны было ўскладзена больш 40 вянкоў ад крайкома комсамола, ад Варашылаўскага абкома ВКП(б) і аблвыканкома, кіраўніцтва НК унутраных спраў, па Далёкаўсходняму краю, рэдакцыі «Тихоокеанского комсомольца», ад вайсковых часцей і мясцовых партыйных, совецкіх і профсаюзных арганізацый.

4 лютага, у 15 гадзін, труны былі ўстаноўлены на лафеты, і жалобная працэсія, суправаджаемая тысячамі працоўных, рушыла да брацкай магілы ў сяле Градэкова. За кожнай труной забітага пагранічніка чырвонаармейцы вялі яго каня са зброяй, прымацаванай к сядлу.

На брацкай магіле выступілі з прамовамі сакратар крайкома ВКП(б) т. **Верны**, намеснік камандуючага прыморскай групай тав. **Пагрэбной**, прадстаўнік калгаса імя Калмыкова і інш. Пад гулкі паравозаў і салют вайсковых часцей целы забітых былі апушчаны ў зямлю.

АДКРЫЦЦЁ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ ПРАПАГАНДЫСТАЎ ПРЫ ЦК ВКП(б)

ВЫСТУПЛЕННЕ САКРАТАРА ЦК ВКП(б) ТАВ. А. А. АНДРЭЕВА

МАСКВА, 8 лютага. (БЕЛТА). 7 лютага адбылося ўрачыстае адкрыццё Вышэйшай школы прапагандыстаў імя Я. М. Свердлова пры ЦК ВКП(б). Уступнае слова сказаў загадчык аддзела партыйнай прапаганды і агітацыі ЦК ВКП(б) тав. **А. І. Стэцкі.**

Громам апладысментаў сустракаюць прысутныя паведамленне тав. Стэцкага аб тым, што Вышэйшая школа прапагандыстаў створана рашэннем ЦК ВКП(б) па ініцыятыве вялікага правадыра партыі таварыша **Сталіна**, які даў чоткія ўказанні аб падрыхтоўцы арганізатараў і кіраўнікоў прапагандысцкай работы.

У часе прамовы тав. Стэцкага ў прэзідыуме паяўляецца сакратар ЦК ВКП(б) тав. **А. А. Андрэеў** і сакратар МК тав. **Н. С. Хрушчоў**, спатканы бурнай авацыяй і прывітальнымі воклічамі ў гонар кіраўнікоў партыі.

Дырэктар школы т. **Уараў** паведаміў аб велізарнай рабоце, праробленай Цэнтральным камітэтам ВКП(б) па арганізацыі школы. Перад ёй пастаўлена задача ў невялікі тэрмін — 1 год 3 месяцы падрыхтаваць кваліфікаваных прапагандыстаў для крайкомаў, абкомаў і ЦК нацкомпартый. У школе будзе вучыцца 300 чалавек. У сучасны момант прынята 230 чал. Большасць з іх — партыйныя работнікі з вялікім стажам і вопытам партыйнай работы.

Затым з прамовамі выступілі — сакратар Цэнтральнага камітэта ВКП(б) тав. **А. А. Андрэеў** і сакратар МК тав. **Н. С. Хрушчоў.**

ШЛЯХ ДА ЗЛУЧЭННЯ КАСПІЙСКАГА МОРА З АЗОЎСКІМ І ЧОРНЫМ

БУДАЎНІЦТВА МАНЫЧСКАГА КАНАЛА

РАСТОЎ-ДОН, 8 лютага. (БЕЛТА). На працягу многіх дзесяцігоддзяў чалавечая мысль не раз шукала шлях да злучэння Каспійскага мора з Азоўскім і Чорным морамі. Але ўсякі раз праекты цярпелі крах, і вякамі ляжала некранутай даліна Маныча — маланаселеная, бяводная, спаленая сухавеямі. Толькі пры совецкай уладзе было пачата практычнае вырашэнне гэтай праблемы.

Зараз на Манычы ажыццяўляецца першая чарга будаўніцтва — пабудова Манычскага рэчнога шляху ад вусця Дона да Кумы. Услед за першай пойдзе другая чарга будаўніцтва — пабудова морскага Манычскага канала, які злучыць Каспій, Волгу, Азоўскае і Чорнае моры.

III сесія ЦВК БССР XI склікання

Заключная прамова старшыні Совета Народных Камісараў БССР тав. Н. М. ГАЛАДЗЕДА

Таварышы! Усе аратары паспярджалі гіганцкія поспехі ў соцыялістычным будаўніцтве, якія мы мелі за 1935 год, і выказвалі сваю згоду з тымі заданнямі, якія вызначаюцца планам народнай гаспадаркі і культуры на 1936 год. Таму ў мяне няма патрэбы спыняцца на выступленнях асобных членаў ЦВК.

Усе члены ЦВК, у тым ліку і тыя, якія працуюць на мясцах, на фабрыках і заводах, у калгасах, у РВК, сельсоветах, акрыканкомах, — усе яны, па-мойму, выказвалі адну думку: план сур'ёзны, размах бярэцца гіганцкі і наша задача заключаецца ў тым, каб мабілізаваць усе нашы сілы і гэты план не толькі выканаць, але і перавыканаць. (Апладысменты).

Таму я спынюся ў сваёй заключнай прамове толькі на некаторых асобных пытаннях.

Першае пытанне — гэта аб арганізацыйнай рабоце нашых наркаматаў, трэстаў і іншых гаспадарчых арганізацый у сувязі са стаханаўскім рухам.

У сваім дакладзе я падрабязна не развіваў гэтага пытання з-за эканоміі часу.

Падкрэсліваю, як аб гэтым я гаварыў у сваім дакладзе, што план 1936 года складзен з улікам стаханаўскага руху як па вытворчасці, так і па аб'ёму капітальнага будаўніцтва. Але, таварышы, адна справа склаці план, другая справа яго выканаць. Падкрэсліваю, што план разлічан на далейшы ўздым стаханаўскага руху.

Усім вядома, што ў час узнікнення стаханаўскага руху, дый цяпер, калі прайшоў значны час пасля ўзнікнення стаханаўскага руху, пасля прамовы таварыша Сталіна і пасля пастаноў пленума ЦК ВКП(б), — не ўсюды яшчэ ў цэнтральных установах рэспублікі, сярод асобных гаспадарнікаў, совецкіх работнікаў і сярод інжынерна-тэхнічных работнікаў наглядаем мы належную раскачку для таго, каб узначаліць гэты стаханаўскі рух. Наадварот, мы яшчэ сустракаемся ў некаторых бюракратычных канцэлярыях з такімі людзьмі, якія не задаволены стаханаўскім рухам, бо ён некаторым бюракратам не па нутру, не падыходзіць. Яны прывыклі спакойна сядзець, пісаць паперкі, павольна рухацца, а стаханаўскі рух патрабуе ад усіх напружанай работы. Стаханаўцы патрабуюць канкрэтнага кіраўніцтва. Таму для іх стаханаўскі рух зваліўся як снег на галаву, і да гэтага часу з'яўляецца перашкодай для іх абывательскага жыцця.

Нельга думаць, што адным загадам ці адной прамовай можна прымусіць перабудаваць работу такіх людзей. Не, таварышы, бюракратызм гэта такая заядлая рэч, што ён можа ўтаіць і вельмі сур'ёзную справу.

Значыць, задача заключаецца ў тым, каб зламаць супраціўленне і непаваротлівасць гэтых людзей, многім з іх дапамагчы перабудавацца, а калі яны не перабудуюцца ў сваёй рабоце, тады прыдзецца вызваляць нашы ўстановы ад такіх людзей, бо мы не можам лічыцца з людзьмі, якія не разумеюць гістарычнага значэння стаханаўскага руху.

Мы павінны адкрыць усе шляхі для шырокага разгортвання стаханаўскага руху і на кожным кроку дапамагаць стаханаўцам у іх рабоце, у іх жыцці. Мы павінны ламаць бюракратычныя перашкоды, якія тармозяць стаханаўскі рух.

Нашы наркаматы, нашы трэсты павінны сапраўды ператварыцца ў вытворча-тэхнічныя штабы па кіраванню вытворчасцю. Такая задача пастаўлена тав. Молатавым у яго дакладзе на сесіі ЦВК Саюза, каб наркаматы ператварыліся ў вытворча-тэхнічныя штабы. Але адна справа, таварышы, паставіць задачу, другая справа, як нашы цэнтральныя ўстановы перабудоўваюцца ў сваёй рабоце.

Некаторыя нашы ўстановы яшчэ не могуць пахваліцца такой перабудовай работы. І нават, калі мы складалі народнагаспадарчы план на 1936 год, то прышлося зверху, з боку Соўнаркома, націскаць на многіх людзей, прымушаць іх больш смела праектаваць вытворчыя заданні на 1936 год. І гэта не выпадкова, бо часта бюракраты з асобных апаратаў яшчэ маюць уплыў і на некаторых нашых кіраўнікоў. Аб гэтым трэба сказаць прама.

Нам прыдзецца ўвесь 1936 год весці работу так, каб не аслаблянь нашай увагі да перабудовы работы цэнтральных устаноў. Мы будзем націскаць зверху на нашы кіруючыя гаспадарчыя арганізацыі і будзем дапамагаць ім перабудоўвацца. Апрача таго, гэты націск будзе ісці знізу, ад саміх стаханаўцаў. Рабочыя-стаханаўцы таксама будуць падштурхваць нашы кіруючыя органы, каб яны паспявалі за стаханаўскім рухам у сваёй рабоце і каб працавалі больш канкрэтна і аператыўна.

Такім чынам, асноўная задача заключаецца ў тым, каб перабудаваць работу так, каб нашы цэнтральныя ўстановы былі сапраўднымі арганізатарамі стаханаўскага руху, а не з'яўляліся тормазам гэтага руху. Трэба мець на ўвазе, таварышы, што план 1936 года, які я вам далажыў, гэта мінімальны план, абавязковы для выканання пры любых умовах.

Мы ўпэўнены ў тым, што паспяховае разгортванне стаханаўскага руху павінна павялічыць рэзервы на ўсіх галінах вытворчасці. І толькі тыя наркаматы ці трэсты, таксама і іншыя цэнтральныя ўстановы, якія ў выніку сваёй аператыўнай дзейнасці на працягу года выявяць гэтыя новыя рэзервы і ўнясуць прапановы ў Соўнарком, каб павялічыць планы іх вытворчасці, — толькі такія наркаматы і ўстановы і будуць называцца аператыўнымі штабамі. А тыя ўстановы, якія будуць хныкаць аб тым, што нібыта для іх зацверджаны павялічаныя і напружаныя планы і яны планаў недавыканаюць, такія ўстановы не могуць прэтэндаваць называцца тэхнічна-вытворчымі штабамі.

А ў некаторых людзей з нашых цэнтральных устаноў існуе такі настрой: ці нельга адстаяць план паменшы, каб лягчэй працаваць, каб павольней жыць і ў той-жа час паказаць, што планы па яго ўстанове выконваюцца. Ёсць такія ў нас людзі, якія наровяць, ці нельга змяншыць напружанасць у іх рабоце.

Не, таварышы, нашы планы з'яўляюцца мінімальнымі планамі, і добрым кіраўніком трэста, кіраўніком цэнтральнай установы будзе той работнік, які з першага-ж месяца забяспечыць поўнае выкананне вызначаных планаў і на працягу года выявіць яшчэ дадатковыя рэзервы і рэсурсы, якія-б далі магчымасць перавыканаць планы, а можа быць і павялічыць іх на працягу года.

Не выпадкова таварыш Сталін у сваёй прамове, як і тав. Молатаў, падкрэсліваў, што нашы планы, якія мы ўстанаўляем, з'яўляюцца мінімальнымі, абавязковымі для выканання пры любых умовах. Так што, таварышы, у мяне ёсць надзея сустрэцца з такімі кіраўнікамі, якія, скажам, у сярэдзіне года прыдуць да нас з прапанфрамі павялічыць ім планы вытворчасці. (Апладысменты). Я лічу, што гэта надзея павінна апраўдацца, бо ў нас на чале гаспадарчых арганізацый стаяць большэвікі, а большэвікі не могуць задавольвацца маленькімі, лёгкімі планамі, тым больш, калі ўсе работнікі прымуць пад увагу словы таварыша Сталіна, сказаныя ім у 1933 годзе пры падвядзенні вынікаў першай пяцігодкі, аб тым, што, прыкладна, у сярэдзіне другой пяцігодкі створацца такія ўмовы, што мы атрымаем новы магутны разбег як у будаўніцтве, так і ў росце прадукцыі прамысловасці. Гэтыя словы ўжо ў 1935 годзе апраўдаліся, бо 1935 год быў пачаткам іменна такога новага магутнага разбегу.

Мне думаецца, што мы з упэўненасцю можам сказаць, што і ў нас, у БССР, 1936 год будзе па ўсіх галінах вытворчасці ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы сапраўды стаханаўскім годам. (Апладысменты).

Яшчэ адна задача — гэта дапамога стаханаўцам у павышэнні іх тэхнічных ведаў.

Вы чыталі пастанову пленума ЦК ВКП(б) пра задачы прамысловасці і транспарту ў сувязі з стаханаўскім рухам. Там сур'ёзнае месца аддаецца задачам тэхнічнай вучобы ўсяго рабочага класа. І гэта не выпадкова, таварышы, бо сам стаханаўскі рух нарадзіўся ў сувязі з тым, што рабочыя пачалі па-сапраўднаму авалодваць тэхнікай. Стаханаўцы, як гэта ўжо было прыведзена на стаханаўскай нарадзе ў Крэмле, здалі тэхмінімум на «выдатна». Гэта тыя людзі, якія аўладалі тэхнікай і атрымалі мінімум тэхнічных ведаў. Таму гэтыя людзі і з'явіліся застрэльшчыкамі стаханаўскага руху. Гэта першае.

Па-другое. Таварыш Сталін, характарызуючы пераход ад грамадства сацыялістычнага ў грамадства комуністычнае, напомніў нам аб тым, што толькі пры ўмове ліквідацыі розніцы паміж фізічнай і разумовай працай мы прыйдзем у комуністычнае грамадства. Прычым, гэта ліквідацыя розніцы паміж фізічнай і разумовай працай павінна ісці па лініі ўздыму тэхнічна - культурнага ўзроўню рабочага класа да тэхнічна-культурнага ўзроўню інжынераў і тэхнікаў. Я ўжо не гавару аб такой задачы, як павышэнне прадукцыйнасці працы, што таксама звязана з аўладаннем тэхнікай з боку рабочага класа і калгаснікаў. Таму ў пастанове пленума ЦК ВКП(б) пытанню тэхнічнай вучобы рабочага класа аддаецца такое вялікае месца.

Мы, члены ЦВК, павінны паставіць перад сабой пытанне, як-жа гэта пастанова пленума ЦК ВКП(б) праводзіцца ў нас у жыцці.

Як у нас арганізавана тэхвучоба? Сёння мы яшчэ не можам пахваліцца добрай арганізацыяй гэтай важнай справы — дапамагчы ўсім рабочым, усім калгаснікам, у першую чаргу стаханаўцам, у іх тэхнічнай вучобе.

Нашы наркаматы павінны ва што-б там ні стала арганізаваць гэту тэхнічную вучобу.

Задача тэхнічнай вучобы, як мне прадстаўляецца, гэта самая важная задача з усіх задач. Бо, калі мы будзем сістэматычна павышаць узровень тэхнічных ведаў рабочага класа, няма чаго і гаварыць аб тым, што праектаванні народнагаспадарчага плана 1936 года будуць абавязкова выкананы. Гэта паказаў нам 1935 год — год узнікнення стаханаўскага руху.

Наступная мая заўвага — гэта аб нашых советах, — сельскіх і гарадскіх, і аб райвыканкомах.

Я перш за ўсё павінен напомніць словы тав. Молатава з яго даклада, дзе ён гаварыў, што нашы советы, асабліва і гарадскія, павінны таксама перабудаваць сваю работу. Ён напомніў, што мы цяпер знаходзімся ўжо ў такім перыядзе, калі нашы гаспадарчыя органы могуць значную частку работы па абслугоўванню рабочага класа перадаць советам, а советы павінны пераняць гэту работу ад гаспадарчых арганізацый.

Гэта вельмі сур'ёзнае пытанне, таварышы. У сувязі з разгортваннем стаханаўскага руху нам трэба перабудаваць і работу советаў, у тым ліку і сельскіх советаў.

Напрыклад, мы вызначылі гіганцкія задачы па ўздыму ўраджайнасці (я паўтараць іх не буду). Не думайце, што іх выкананне пойдзе само па сабе, самацёкам. Ні ў якай ступені. І наша задача заключаецца ў тым, каб сельсоветы не засталіся ў баку, у хвасце ад той барацьбы за высокі ўраджай, за сталінскі ўраджай, якая будзе весціся перадавымі калгаснікамі ва ўсіх калгасах.

Советы павінны ўзначаліць гэту барацьбу за сталінскі ўраджай, за развіццё жывёлагадоўлі, за ўмацаванне калгасаў і наогул за павышэнне калгаснай вытворчасці.

Таварышы, у нас ужо ёсць перадавыя калгасы, і іх нямала, якія дасягнулі высокага ўраджаю. Але ў нас яшчэ ніхто не назваў такіх сельсоветаў у цэлым, у якіх-бы ўсе калгасы выйшлі з высокім ураджаем. Трэба лічыць, што няма яшчэ ў БССР такіх сельсоветаў, дзе ўсе калгасы былі-б выцягнуты на перадавыя пазіцыі і каб сельсоветы ў цэлым былі сельсоветамі высокага ўраджаю. Больш такіх сельсоветаў у нас, у якіх ёсць перадавыя калгасы з высокай ураджайнасцю, але ёсць і адсталыя калгасы.

Чым-жа гэта тлумачыцца? У першую чаргу, тлумачыцца гэта тым, што сельсоветы, як органы дыктатуры пролетарыята, арганізатары вытворчасці, — а яны павінны быць такімі арганізатарамі вытворчасці, — яшчэ не ўсюды сталі сапраўднымі арганізатарамі.

Значыць, наш абавязак — падцягнуць сельсоветы, падцягнуць работу выканкомаў, падцягнуць работу горсоветаў.

Прычым ва ўвесь свой рост стаіць задача вылучэння жанчын-калгасніц на перадавыя пазіцыі вытворчасці. У нас ёсць тысячы лепшых калгасніц, якія апяраджаюць часта калгаснікаў-мужчын у справе барацьбы за ўраджай. У нас ёсць дзесяткі тысяч работніц у прамысловасці БССР, і значная частка з іх паказваюць прыклады высокай прадукцыйнасці і з'яўляюцца сапраўднымі стаханаўцамі.

Вось тут, на сесіі, выступала работніца фабрыкі «КІМ» Норкіна, з Віцебска. Яна тут скромнічала ў сваім выступленні. Бо тав. Норкіна, якая зараз з'яўляецца членам ЦВК БССР, ужо на працягу 4—5 год перавыконвае нормы выпрацоўкі на многа процантаў. (Апладысменты). Я быў у іх на фабрыцы і бачыў, як яна са сваёй брыгадай працавала ля варштата. Праўду кажучы, у яе рукі лепш ходзяць, чым рыдагі машыны. Мала таго, што яна сама паказвае ўзоры работы, высокай прадукцыйнасці працы, яна ўсю сваю брыгаду цягнула і цягне за сабой, і брыгада Норкінай была вядомай ва ўсім Совецкім Саюзе. Такія работнікі, як тав. Норкіна, гэта сур'ёзныя арганізатары высокай прадукцыйнасці працы.

Але нельга сказаць, таварышы, — на сесіі мы павінны гэта падкрэсліць,—што ў нас, скажам, бытавыя ўмовы для работніц забяспечаны ўсюды добрыя. Задача разгортвання стаханаўскага руху патрабуе абавязковага ўзмацнення абслугоўвання бытавых запросаў работніц і калгасніц. Задача нашых гаспадарнікаў, горсоветаў і іх секцый, сельсоветаў заключаецца ў тым, каб максімум сваёй увагі накіроўваць на паляпшэнне абслугоўвання бытавых патрэб работніц і калгасніц, каб даць ім магчымасць разгарнуцца на вытворчасці ва ўсю.

Наступная мая заўвага — гэта аб далейшай калектывізацыі. У нас, у Беларусі, больш 85 проц. сялянскіх гаспадарак ужо аб'яднаны ў калгасы, але 15 проц. лічацца яшчэ па-за калгасам. Дык вось устае пытанне, таварышы: што мы на гэтым спынімся, ці што? Гэтыя 15—18 проц.—яны нехай сабе і вякуюць аднаасобнікамі? Не, таварышы. Так не павінна быць. Мы не будзем у народнагаспадарчы план уводзіць лічбу далейшай калектывізацыі. Гэта непатрэбна. Але кожны для сябе павінен зрабіць вывад, што трэба нарэшце пакончыць з аднаасобным сектарам і калектывізацыю ў 1936 годзе завяршыць поўнасцю. (Апладысменты). Адным словам, 1936 год і ў справе калектывізацыі павінен быць стаханаўскім годам. (Бурныя апладысменты. Галасы: «Правільна»). Значыць, такая задача перад намі стаіць.

Цяпер аб кані. Я спецыяльна аб кані ў сваім дакладзе спыняўся, прывёўшы лічбы прыросту конскага паголоўя. Але зараз я хачу яшчэ больш падкрэсліць, што гэта сур'ёзная справа, таварышы.

Паўтараю, мы маем прырост конскага паголоўя ў 1935 годзе на 0,8 проц. Малы прырост, таварышы. А конь нам патрэбен не толькі для гаспадаркі, але і для абароны нашай краіны. Таму мы павінны зрабіць так, каб у Беларусі было як мага больш коней і каб былі самыя лепшыя коні. Конь у сталучэнні з трактарам і аўтамабілем — гэта вялікая сіла. Конь і аўтамабіль, конь і трактар не знаходзяцца ў супярэчнасці ні ў якой ступені. Наадварот: адзін другога дапаўняе. Некаторыя гора-палітыкі лічылі, што раз прыбаўляецца ў сельскай гаспадарцы трактараў і аўтамабіляў, то конь ужо не патрэбен. Гэта абсалютна не наша палітыка, гэта няправільная палітыка. Нельга процапастаўляць адно другому—трактар каню і наадварот. Для народнай гаспадаркі, у першую чаргу для сельскай гаспадаркі і для абароны краіны, конь мае вялікае значэнне. Прашу аддаць увагі каню як можна больш і, раз'ехаўшыся з сесіі ЦВК, трэба вам заваставрыць гэту справу як след.

Яшчэ адна заўвага. У нас часамі бывае так, што за агульнымі нашымі поспехамі перастаюць бачыць недахопы ў рабоце на канкрэтных участках. Нам не трэба замазваць нашы поспехі, а поспехі ў нас сапраўды гіганцкія. Яны паказваюць, як нам народ узнімаецца ўверх, яны паказваюць сапраўдныя гераічныя намаганні рабочага класа і калгаснікаў, паказваюць павышэнне ўзроўню нашага жыцця і матэрыяльна і культурна. Але нельга супакоіцца на дасягнутых поспехах і думаць, што далей усё будзе ісці само па сабе і справа пойдзе ў нашай рабоце бесперашкодна, што ніхто нам больш не будзе перашкаджаць. Некаторыя людзі думаюць так: «што-ж, кулака мы ўжо ліквідавалі, справа ідзе ўверх, значыць наступіла мірнае, спакойнае жыццё».

Такія разважанні пагубны для нашай далейшай работы. У нас разам з поспехамі ёсць яшчэ нямала недахопаў і нават прарываў. Не перавяліся таксама ў нашай краіне яшчэ і такія людзі, якія перашкаджаюць працаваць, якія падрываюць справу сацыялістычнага будаўніцтва.

У сваіх выступленнях таварышы мала гаварылі аб нашых недахопах, таксама і аб барацьбе за ліквідацыю астаткаў капіталістычных класаў. Што-ж вы думаеце— іх, класава-варожых элементаў, у нас ужо няма, мы з імі раз назаўсёды пакончылі? Не, таварышы, гэта не так, далёка не так. Вось прыклад: праверка партыйных дакументаў у КП(б)Б паказала, што не толькі ў калгасах, не толькі на прадпрыемствах, а нават у партыйных арганізацыях мы выявілі нямала ворагаў — ворагаў, якія ўсімі мерамі імкнуліся падарваць наш паспяховы рух наперад, падарваць справу сацыялістычнага будаўніцтва. Дык гэта-ж унутры партыйных арганізацый, дзе кантролю было больш, а ў калгасах сярод калгаснікаў, на фабрыках сярод рабочых, куды ворагі пралазяць пад рознымі прыкрыццямі, яшчэ астаткі класава-варожых элементаў адтуль не выкінуты. Наглядаюцца яшчэ прамыя ворагі стаханаўскага руху, якія стараюцца падарваць стаханаўскі рух. Ёсць таксама яшчэ нямала прамых ворагаў, зрываючых барацьбу за высокі ўраджай.

Яшчэ ўнутры калгасаў класавая барацьба не зжыта. Не выпадкова тав. Молатаў у сваім дакладзе напомніў, што класавы вораг зараз рознымі метадамі творыць сваю гнусную справу.

Таму, таварышы, пры выкананні народнагаспадарчага плана і ў прамысловасці і ў сельскай гаспадарцы абавязкова патрэбна завастрыць класавую пільнасць з тым, каб дабіць астаткі капіталістычных элементаў. Толькі мабілізуючы рэвалюцыйную пільнасць, завастраючы яе на кожным кроку, у кожным калгасе, на кожным прадпрыемстве, толькі пры такіх умовах будзе з поспехам выканан план і з поспехам будзем разгортваць стаханаўскі рух. На гэта я зварачаю вашу ўвагу, таварышы.

Не забывайце слоў і ўказанняў таварыша Сталіна, які заўсёды вучыць нас быць класава пільнымі работнікамі і непрымірымымі да класавага ворага.

Гэта асноўныя мае заўвагі.

У мяне склалася такое ўражанне пры выступленні членаў ЦВК, што план, які прадстаўлен Соўнаркомам БССР на разгляд сесіі ЦВК, будзе зацверджан (бурныя апладысменты), а калі ён будзе зацверджан, то напэўна будзе і выкананы (бурныя апладысменты).

А калі план гэты мы выканаем, то Совецкая Беларусь пры дасягненні ўраджаю ў 12—13 цэнтнераў зернавых з гектара, ды 3,7—4 цэнтнеры ільновалакна з гектара сапраўды ператворыцца са спажываючай рэспублікі ў рэспубліку вытвараючую, г. зн. у рэспубліку багацця, а пры выкананні плана прамысловасці мы будзем яшчэ больш моцнай індустрыяльнай рэспублікай, бо ў нас ужо сёння ўдзельная вага прамысловай прадукцыі перавальвае за 70 процантаў у параўнанні з прадукцыяй сельскай гаспадаркі.

З усіх выступленняў, якія тут былі, відаць, што палітыка нашага совецкага ўрада Саюза, у тым ліку і міжнародная палітыка, атрымлівае поўнае адабрэнне з боку сесіі ЦВК БССР, і на нашай сесіі выявілася абсалютнае адзінства думкі членаў ЦВК (апладысменты), а значыць і адзінства думкі ўсіх рабочых і калгаснікаў і ўсіх працоўных Беларусі (бурныя апладысменты).

Наша сесія адобрыць унутраную і замежную палітыку ўрада Совецкага Саюза. (Апладысменты).

Таварышы, праз 10 дзён наша совецкая краіна будзе святкаваць 15-гадовы юбілей пагранічных войск НКУС. Гэта — пачэсны і слаўны юбілей, бо калі мы гаворым аб нашай Беларусі, калі мы гаворым аб граніцах усяго Совецкага Саюза, то, трэба прама сказаць, што слаўныя нашы чэкісты-пагранічнікі на працягу ўсяго часу існавання совецкай улады былі сапраўды вернымі сынамі рэвалюцыйнага совецкага народу (бурныя апладысменты), яны і надалей будуць такімі. (Апладысменты).

Напрыклад, мы ў Беларусі жывем за спіной пагранічнікаў спакойна і ўпэўнены, што ні адзін прахвост з лагера польскіх або нямецкіх фашыстаў не пройдзе нашу граніцу без пакарання. І мы маем не адзіныя выпадкі, калі нашы слаўныя байцы-пагранічнікі, рызыкуючы сваім жыццём, не дапускалі ворага праз нашы граніцы, а калі ворагі і пралазілі, то іх тут-жа лавілі. (Апладысменты).

Раз'ехаўшыся на месцы, вы павінны, таварышы, падрыхтаваць юбілей пагранічнікаў як належыць, і правесці яго такім чынам, каб усе калгаснікі Беларусі, увесь рабочы клас прынялі ўдзел у святкаванні гэтага слаўнага юбілею пагранічнікаў-чэкістаў. (Апладысменты). Трэба, каб у час пятнаццатай гадавіны адчувалася яшчэ большая сувязь нашых рабочых і калгаснікаў з байцамі-пагранічнікамі. Трэба, каб нашы пагранічнікі, рабочыя і калгаснікі яшчэ больш пранікаліся думкай адзінства — захоўваць граніцы ў парадку, пранікаліся думкай недатыкальнасці нашых совецкіх граніц.

Трэба, каб 15-гадовы юбілей яшчэ больш паслужыў справе ўзмацнення адзінства ў рабоце пагранічнікаў з работай нашых рабочых і калгаснікаў, калгасаў, фабрык, заводаў. А гэта азначае, што рабочыя і калгаснікі, павінны акружыць яшчэ большай любоўю нашых пагранічнікаў.

У сваім дакладзе я гаварыў аб тым, што на Далёкім Усходзе асабліва нас турбуюць. Японцы там нахабнічаюць, і нашы пагранічнікі-чэкісты праяўляюць надзвычайнае геройства, беззаветную адданасць нашай радзіме па ахове совецкіх граніц. Расказваюць, што калі японскі атрад перайшоў на нашу тэрыторыю і напаў на нашых пагранічнікаў, то адзін наш пагранічнік, будучы ўжо раненым, лежачы, застрэліў чатырох нападаючых японцаў. (Бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты).

Узмацненне радоў нашай пагранічнай аховы, радоў байцоў пагранічных войск, яшчэ большае збліжэнне рабочых і сялян з пагранічнікамі, дапамога ім у іх цяжкай, але пачэснай рабоце — гэта наша агульная задача.

Камандзіры і байцы пагранічных войск свята захоўваюць большэвіцкія традыцыі нашай партыі і сваіх правадыроў тт. Дзяржынскага, Менжынскага і Ягоды. Гэта — верныя вартавыя нашай социялістычнай рэвалюцыі.

Канчаю, таварышы, сваю заключную прамову.

Такім чынам, план мы абмеркавалі. Сесія яго зацвердзіць. План гэты гіганцкі. Ён узнімае нашу краіну на новую высокую ступень.

Сур'ёзнасць міжнароднай абстаноўкі мы выяснілі, мабілізавалі ўвагу шырокіх працоўных мас на ўзмацненне нашых совецкіх граніц.

І мне застаецца закончыць сваю прамову словамі таварыша Молатава, які сказаў: «Прышоў час, калі стары свет павінен уступіць дарогу новаму свету».

Няхай жыве правадыр працоўных усяго свету таварыш Сталін!

(Бурныя апладысменты. Зала стоячы наладжвае доўгую авацыю).

Прамова акадэміка С. Я. ВАЛЬФСОНА

Таварышы, летам гэтага года мы будзем святкаваць 15-годдзе першай вышэйшай навучальнай установы ў БССР — Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У той час — 15 гадоў таму назад — наша Беларусь не мела ні адной ВНУ, ні аднаго вышэйшага навучальнага інстытута, ні аднаго студэнта і беларускага вучонага.

Прайшло 15 гадоў і, дзякуючы мудрай палітыцы нашай партыі, дзякуючы ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыцы і жалезнай волі большэвікоў, мы маем сёння ў Совецкай Беларусі паўтара дзесятка вышэйшых навучальных установаў, 40 навукова-даследчых установаў.

Калі адкрываўся Беларускі дзяржаўны універсітэт, нас, вучоных, было 59 чалавек. Сярод іх значная частка былі варожыя нам людзі.

Прайшло якіх-небудзь 15 гадоў, і мы на сённяшні дзень маем у нашай Совецкай Беларусі 1.600 навуковых работнікаў, пераважная частка з якіх сыны рабочага класа, сыны працоўнага сялянства, выхадцы з самай гушчы народных мас.

Гэта — з'ява сусветна-гістарычнага значэння. Для таго, каб зразумець, як велікі нашы дасягненні ў справе навукі, я дазволю сабе толькі пару параўнанняў.

Возьмем тое, што робіцца ў нас і параўнаем з нашай бліжэйшай суседкай — з панскай Польшчай.

Дзяржаўная статыстыка Польшчы казырае лічбай у 24 вышэйшыя навучальныя ўстановы. Я ўжо не буду гаварыць, якія гэта ВНУ. Даволі сказаць, што сярод гэтых 24 вышэйшых навучальных устаноў ёсць і такія паршывенькія «ВНУ», як ксяндзоўская акадэмія і рабінскі ешыбот.

Але калі ўзяць гэту лічбу 24 ВНУ, якою яны казыраюць, то што гэта значыць? Гэта значыць, што ў Польшчы прыходзіцца адна ВНУ на 1.300 тыс. насельніцтва. Гэта ў той час, калі ў нас, у Совецкай Беларусі, адна ВНУ прыходзіцца на 350 тыс. насельніцтва. Гэта значыць, што мы ў чатыры разы абагналі Польшчу ў гэтых адносінах.

Калі параўнаць колькасць нашых студэнтаў з колькасцю студэнтаў у краінах капіталістычнага Захада, то ў Германіі на 10.000 насельніцтва прыходзіцца 18 студэнтаў. А мы ў Совецкай Беларусі, якая нядаўна была няграматнай, некультурнай, лапцюжнай, маем цяпер 29 студэнтаў на 10.000 насельніцтва. Мы амаль у два разы абагналі перадавыя капіталістычныя краіны Захада.

Даволі сказаць, што мы тут, у нашай чырвонай сталіцы Совецкай Беларусі, якая пару дзесяткаў гадоў таму назад была гандлярскім гарадком, гарадком нацыянальнай грызні, мы тут у нас, у Менску, маем сёння больш вышэйшых навучальных устаноў, больш навуковых устаноў, чым маюць многія сталіцы капіталістычнага Захада. У нас, у Менску, больш ВНУ, чым у Белградзе, Сафіі, Мюнхене, Кенігсбергу і цэлым радзе гарадоў — хвалёных калысках капіталістычнай культуры і цывілізацыі.

Хто вучыцца ў нашых ВНУ і хто там вучыцца? Навучальныя ўстановы Польшчы, Германіі, Венгрыі запоўнены панічамі «белай косці», чыноўніцкімі і афіцэрскімі сынкамі, гандлярскімі выхаванцамі. А ў галіне нацыянальнай палітыкі, што там робіцца? У Вільні ёсць так званы універсітэт Сцефана Баторыя, там з 4 а паловай тысячы студэнтаў 97 беларусаў (2 проц.). Гэта ў той час, як у нашых вышэйшых навучальных установах беларусы складаюць больш паловы студэнцтва.

А социяльны склад нашага студэнцтва, нашых навуковых работнікаў, калі параўнаць з капіталістычнымі краінамі? Я не памылюся, калі скажу адносна сябе, адносна цэлага раду іншых навуковых работнікаў, што найвялікшым гонарам кожнага з нас з'яўляецца тое, што мы маем ужо не адзін дзесятак нашых вучняў, якія 10—15 гадоў таму назад былі няграматнымі, некультурнымі батракамі і чорнарабочымі, якія сёння з'яўляюцца ўжо дацэнтамі, прафесарамі беларускіх ВНУ.

На парозе рэканструкцыйнага перыяда таварыш Сталін геніяльна прадсказаў, што наша краіна з уступленнем у паласу социялізма ператворыцца ў пытадэль сусветнай навукі.

Гэтыя геніяльныя словы нашага правадыра на сёння ўжо апраўдаліся. Мы можам сказаць, што слупавую дарогу сусветная навука пракладае сёння праз Саюз Совецкіх Социялістычных Рэспублік.

Поўнасцю ўяўляючы сабе гэтыя грандыёзныя дасягненні, мы, навуковыя работнікі, павінны, аднак, не паддавацца галавакружэнню ад поспехаў, павінны не забываць аб тым, што і на нашым фронце ёсць рад прарываў, за якія нас правільна крытыкуюць.

Вось чаму зараз мы, навуковыя работнікі, ставім сваёй важнейшай і галоўнейшай задачай перабудаваць нашу навуку так, як гэтага патрабуе стаханаўскі рух.

Мы, навуковыя работнікі, ведаем, што ўвесь росквіт нашай навукі магчымы толькі да таго часу, пакуль непахісна і магутна дыктатура пролетарыята. Нашы навуковыя работнікі ў пераважнай сваёй частцы добра ведаюць, што фашызм азначае не толькі збяднение і галаданне сялянства, што фашызм гэта не толькі пятля на шыі рабочага, што фашызм гэта не толькі нацыяналістычная грызня, а фашызм гэта гібель навукі, смерць навукі. І таму пярвейшым абавязкам кожнага совецкага вучонага з'яўляецца — быць гатовым да абароны нашай радзімы ад усіх пасягнанняў фашысцкай сволачы на нашы социялістычныя рубяжы. Нашы вучоныя ставяць на службу абароне ўсе свае веды, сілы і здольнасці.

Дазвольце, таварышы, скончыць воклічам:

Няхай жыве рабочы клас, чыя дыктатура зрабіла магчымым такі нечуваны ў гісторыі росквіт навукі ў нашай краіне.

Няхай жыве партыя, якая натхняе пролетарскую дыктатуру і кіруе ёю ў нашай краіне.

Няхай доўга, доўга яшчэ б'ецца самае палкае сэрца, якое мае сучаснае чалавецтва, няхай яшчэ доўга, доўга працуе самы геніяльны мозг, якім уладае сучаснае чалавецтва, няхай яшчэ доўга, доўга жыве наш геніяльны правадыр таварыш СТАЛІН! (Апладысменты).

Прамова т. Н. В. СЯРОЖКІНА

ЗМЕННЫ МАЙСТАР ПАЯЛЬНАГА ЦЭХА КРЫЧАЎСКАГА ЦЭМЕНТНАГА ЗАВОДА

Перш за ўсё я павінен па даручэнню рабочых-стаханаўцаў цементнага завода перадаць 8-й сесіі ЦВК палкае прывітанне. (Апладысменты).

Нельга не спыняцца на тым, чаго мы дасягнулі. Я вам прыведу некаторыя дасягненні ў час нашых стаханаўскіх сутак і пяцідневак. Па памольнаму цэху ў час стаханаўскіх сутак мы дасягнулі 158 процантаў выпрацоўкі па помолу, па кар'еру —120 проц., па абпалу—150 проц., па механічнаму цэху—148 проц., па ЦЭС —148 проц., па транспарту—147 проц., па памолу вугалю—207 проц., па будаўнічаму цэху—151 проц. Вось нашы дасягненні ў час стаханаўскіх сутак.

Тое-ж і ў пяціднеўкі: абпал клінкера — 127 проц., памол цэменту —173 проц., адгрузка цэменту—114 проц.

Побач з гэтымі дасягненнямі ў нас ёсць яшчэ і недахопы, аб якіх нельга забываць. Тав. Галадзед у сваім выступленні адзначыў, што самае галоўнае—гэта торф. У нас электрастанцыя працуе на торфе. Калі няма торфу, усе агрэгаты спыняюцца, а гэта пагражае выкананню плана.

Таварышы, у нас на заводзе 150 стаханаўцаў. Але мы на гэтым не супакойваемся. У рады стаханаўцаў становіцца ўсё больш і больш рабочых, і 1936 год будзе ў нас стаханаўскім годам.

Заканчваючы сваё выступленне, я запэўняю сесію ЦВК, што ў 1936 годзе ўсе будзем працаваць па-стаханаўску.

Няхай жыве наш вялікі правадыр таварыш Сталін! (Апладысменты).

III сесія ЦВК БССР XI склікання

Прамова тав. З. Д. НЕЙШТАТА

НАМ. НАРКОМА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ

У мінулым годзе на з'ездзе саветаў сталў даклад аб ахове здароўя. Мы атрымалі пэўныя дырэктывы, пэўныя заданні. Дазвольце мне ў некалькіх словах расказаць, як мы ажыццяўляем гэтыя заданні. У нас, у Беларусі, была надзвычайна дрэнна пастаўлена санітарна-гігіенічная справа. Я мічу, што мы ў 1935 годзе ў гэтай частцы маем значныя поспехі. Перш за ўсё, мы стварылі санітарную арганізацыю, якой амаль не было ў Беларусі, мы ўзмацнілі санітарную арганізацыю ў наркамаце, а таксама ў Менску, дзе правялі надзвычайна вялікую работу.

Справа аховы здароўя патрабуе таго, каб масы самі прымалі ў гэтым удзел. Асабліва гэта адносіцца да вёскі. Мы абвясцілі конкурс на лепшы ў санітарных адносінах раён. І мы маем надзвычайна каштоўныя паказальнікі. Напрыклад, мы падрыхтавалі 16 тысяч з лішкам грамадскіх санітарных інспектароў, з якіх 12 тысяч прайшлі курсы санітарнай граматы.

Я помню, як у мінулым годзе, калі мы на з'ездзе саветаў атрымалі дырэктыву пабудаваць у калгасах 1.500 лазняў, мы хапелі гэта ўскласці на Народны камісарыят земляробства, лічачы, што калгасы бліжэй да Наркамзема. Але Наркамзем адмовіўся, заявіў, што для гэтага патрэбна некалькі мільёнаў рублёў капіталаўкладанняў. Я вам магу сёння рапартаваць, што на 1 снежня мы пабудавалі ў калгасах 1.000 лазняў і 570 лазняў заканчваем.

У 1935 годзе мы вялікую ўвагу аддавалі і дабіліся значных поспехаў у справе родавай дапамогі. У нас адкрыта 58 хат-радзільняў замест намечаных 30. Потым мы падрыхтавалі больш 500 акушорак. К 1 мая мы разгорнем 400 акушорскіх пунктаў па сельсоветах. Нам дано заданне з'ездам саветаў, каб у канцы 1937 г. кожны сельсавет меў акушорскі пункт. На працягу 1935 года паловy гэтага задання мы выканалі.

За лета 1935 года мы прапусцілі праз санітарныя лагеры 7 тысяч дзяцей. Мы арганізавалі ў 1935 годзе дзіцячы санаторый у Крынках на 170 коек, дзіцячы сухотны санаторый у Астрашыцкім Гарадку на 75 коек, начны дзіцячы санаторый у Магілеве на 30 коек. На 1936 год намечана значна больш дзіцячых устаноў: усебеларуская здраўніца, начныя і дзённыя санаторыі.

У нас вельмі мала ўрачоў на вёсцы, па двух прычынах. Першая прычына гэта тая, што нарком аховы здароўя дрэнна працуе. Ён не накіроўвае ўрачоў на вёску, а туды, куды ўрач просіцца. Другая прычына тая, што райвыканкомы не ствараюць для работы ўрачоў умовы і ўрачы ад іх бягуць.

Вы павінны ведаць, што культурныя запросы зараз высокія, і ва ўрача культурныя запросы большыя. І таму, калі ўрач падае к вам, вы абавязаны яму стварыць неабходныя ўмовы.

У перыяд красавік—ліпень месяцы ў нас пачнецца выпуск урачоў, і мы пашлем на вёску да 500 урачоў. Мы запоўнім усе участкі. Але мы патрабуем, каб урачы атрымалі кватэру, агарод і яшчэ сёе-тое. Я аб гэтым гаварыў з тав. **Сааканам.** У РСФСР ёсць пастанова аб тым, каб урачу на льготных умовах далі карову. Мне здаецца, што і ў нас гэтага трэба дабіцца.

Перад намі стаіць задача ўмацаваць калгасную медыцыну, умацаваць санітарную арганізацыю на вёсцы. Мы атрымліваем для вёскі 500 урачоў, атрымліваем, апрача таго, 1.000 чалавек сярэдняга медперсаналу — фельчароў, акушорак і медсясцёр, якіх мы пасылаем на вёску. Мы абавязаны падрыхтавацца да прыёму гэтай велізарнай колькасці людзей.

Я ўпэўнены, што пад кіраўніцтвам партыі і ўрада мы ліквідуем адставанне аховы здароўя, не будзем адставаць на гэтым участку, а будзем ісці ў нагу з усім сацыялістычным будаўніцтвам. **(Апладысменты).**

Прамова тав. Е. І. ГЛАДЫШЭВА

РАБОЧЫ-СТАХАНАВЕЦ БАБРУЙСКАГА ЛЕСАКАМБІНАТА

Таварышы, я памятаю, як на XI з'ездзе Саветаў загадчык промаддзела ЦК КП(б)Б тав. **Готфрыд** у сваім выступленні крытыкаваў Бабруйскі раён, у прыватнасці бабруйскі лесакамбінат за тое, што мы не спраўляемся з ускладзенымі на нас задачамі, не выконваем вытворчай праграмы. К III-яй сесіі ЦВК Бабруйскі раён і наш лесакамбінат прышлі з вялікімі поспехамі ў справе выканання вытворчай праграмы, у справе разгортвання стаханаўскага руху.

Пасля таго, як Алексей Стаханаў вырубіў замест 7 тон 102 тоны вугалю, пасля таго, як тав. Мусінскі замест 90 кубаметраў распілаваў 163 кубаметры лесу, стаханаўскі рух пачаў разгортвацца і на нашым камбінаце. Я першы ўстанавіў усебеларускі рэкорд: распілаваў замест 90 кубаметраў 145 кубаметраў лесу. Хутка мяне абагналі тт. Рушко, Адзінцоў, Міхалінскі, Іваноў, Буднік і інш., якія распілявалі нават да 190 кубаметраў.

Асабліва разгарнуўся ў нас стаханаўскі рух, калі мы пачалі спаборнічаць з архангельскім лесазаводам, у прыватнасці з тав. Мусінскім. Мы распілавалі 201 кубаметр, яны 250—280 кубаметраў. Праз некалькі дзён мы абагналі архангельцаў, назаўтра яны нас зноў абагналі. Мы штодзённа абменьваемся тэлеграмамі з Архангельскам. Сёння мы наперадзе, заўтра яны. Нядаўна я ўстанавіў новы ўсесаюзны рэкорд — распілаваў 523 кубаметры лесу. У выніку гэтага спаборніцтва наш бабруйскі лесакамбінат усё-ж апярэдзіў архангельскі лесазавод, і мы занялі першае месца ў Саюзе. Тав. Молатаў у сваім дакладзе на пленуме ЦК ВКП(б) гаварыў аб Беларусі і, у прыватнасці, аб бабруйскім лесакамбінаце, гаварыў аб тым, як бабруйскі лесакамбінат уключыўся ў стаханаўскі рух і мае нядрэнныя паказальнікі работы.

У кастрычніку 1935 года на нашым лесакамбінаце з 3.000 рабочых стаханаўцаў было толькі 107 чал. На 1-е студзеня 1936 года мы ўжо маем 976 стаханаўцаў.

Як мы спраўляемся з задачамі 1936 года, якія пастаўлены перад лесакамбінатам? Вытворчая праграма камбіната супроць 1935 года павялічана на 40 проц. За студзень павялічаная праграма па ўсяму лесакамбінату выканана на 119,3 проц.

Нашы стаханаўцы, напрыклад, тав. Рушко і інш., гавораць, што мы мала павялічылі праграму, трэба было павялічыць не на 40 проц., а на 50 проц.

У развіцці стаханаўскага руху нам многа дапамагло раённае кіраўніцтва: партыйнае, профсаюзнае, гаспадарчае і асабліва сакратар райкома партыі тав. **Чарнышоў.**

Чарвякоў. Маладзец тав. Чарнышоў.

Гладышаў. Сапраўды маладзец. Тав. Чарнышоў прысутнічаў на кожнай нашай вытворчай нарадзе. Калі патрабавалася, то тав. Чарнышоў і ўдзень і ўночы заўсёды знаходзіўся ў цэху, дапамагаў нам.

У нас былі і такія людзі, якія выступалі супроць стаханаўскага руху, напрыклад, тэхнарук Альберцін, нарміроўшчык пэха Сандлер. Але яны атрымалі «па зубах», як гаварыў таварыш Сталін, іх знялі з кіраўніцтва і паставілі сапраўдных большэвікоў, якія дапамагалі ў наладжванні справы.

Я хацеў яшчэ спыніцца вось на чым. Горад Бабруйск цяпер ужо не той мяшчанскі горад, якім ён быў калісьці. Цяпер Бабруйск стаў прамысловым горадам з 25 тыс. рабочых. Але, тав. Чарвякоў, у нас няма кінотэатра. Той кінотэатр, які ёсць, быў добры 10 гадоў таму назад, а цяпер патрабаванні выраслі. Трэба будзе на гэту справу звярнуць увагу.

Наш бабруйскі камбінат узяўся нядрэнна і за абарончую работу. Калі я быў у Маскве на прыёме ў тав. **Лобава**, нас прымаў і тав. **Эйдэман**, які гаварыў з намі аб абарончай рабоце. У гэтай галіне мы сёе-тое прарабілі. Рабочыя бабруйскага лесакамбіната згуртаваны ў адно цэлае, працуюць па-стаханаўску і па клічу партыі і ўрада, калі вораг суне сваё свінное рыла ў наш совецкі агарод, рабочыя нашага камбіната па-стаханаўску ўстануць на абарону сацыялістычнай бацькаўшчыны.

Чарвякоў. Правільна.

Гладышаў. Нашы рабочыя дадуць ворагу адпор па-стаханаўску. **(Апладысменты).**

Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі камбіната і райкома, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і ЦК ВКП(б) план 1936 года мы з гонарам выканаем і перавыканаем.

Няхай жыве наша Комуністычная партыя большэвікоў!

Няхай жыве наш правадыр, друг і настаўнік таварыш **СТАЛІН!**

Прамова тав. М. А. ГУРЫНОВІЧ

СТАРШЫНЯ КАЛГАСА «ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ», БЯГОМЛЬСКАГА РАЁНА

Сёння на трэцяй сесіі ЦВК БССР я хачу расказаць, як наш калгас выканаў задачы, пастаўленыя перад намі партыяй і ўрадам на 1935 год.

Перш за ўсё аб жывёлагадоўлі. Па плану 1935 года мы павінны былі выгадаваць 15 шт. цялят. Наш калгас выгадаваў 31 цялё. Мы перавыканалі план і па пагалоўю рагатай жывёлы: замест 49 галоў па плану, наш калгас мае 61 галаву, трое цялят далі бескароўным калгаснікам. Па авечках замест 20 шт. па плану наша ферма мае 27, па свінаферме план намячаў 65 галоў і ферма мае 65 галоў, а 19 галоў маладняка раздалі калгаснікам.

План мясапаставак па свіннях калгас перавыканаў да 12 верасня 1935 года.

Некалькі слоў аб дарожным будаўніцтве. Калгасу быў дан план на 1935 год у 234 конепрацадні. Калгас даў 387 конепрацадзён, гэта значыць перавыканаў на 53 конепрацадні. Пешых працадзён дана было заданне ў 1935 годзе 246, а мы выканалі — 258. План работ па дарожнаму будаўніцтву мы выканалі да чэрвеня 1935 года.

Да веснавой пасеўнай кампаніі 1936 года мы падрыхтаваліся не дрэнна: адрамантавалі цялегі, плугі, бораны і астатні інвентар поўнасцю.

Запэўняю нашу партыю і ўрад, што нашы калгаснікі і калгасніцы і ў далейшым будуць змагацца за ўсе планы, якія будуць даны партыяй і ўрадам. І мы не здамо сваіх тэмпаў, будзем змагацца і дабіваццa таго, каб наш калгас «Ленінскі шлях», які знаходзіцца на рубяжы двух светаў, быў калгасам узорным, прыкладным.

Няхай-жа жыве наша комуністычная партыя большэвікоў!

Няхай жыве наш любімы правадыр таварыш **Сталін! (Апладысменты).**

Прамова тав. С. М. СЫМАНА

СТАРШЫНЯ БУЧАЧЫНСКАГА СЕЛЬСОВЕТА, ЧЫРВОНАСЛАБОДСКАГА РАЁНА

Таварышы, калгасы Чырвонаслабодскага раёна жывуць на стыку двух светаў — свету, які будуе сацыялізм, і свету, які задыхаецца ў ціскаў крызісу.

Я хачу сёння расказаць сесіі ЦВК БССР, як калгасы нашага раёна змагаюцца за павышэнне ўраджайнасці, за далейшы ўздым калгаснай гаспадаркі. Прывяду толькі некалькі прыкладаў.

Брыгада т. **Плевака** ў калгасе «Трэці рашаючы» дабілася ўраджаю ў 22 цэнтнеры аўса і 20 цэнтнераў ячменю з гектара. У калгасе «12-годдзе» у м. Семежава ёсць калгасніца, якая дабілася прыплоду ад 7 свінаматак да 78 дзелавых парасят.

Мы распрацавалі выступленне таварыша **Сталіна** на нарадзе перадавых камбайнераў і камбайнерак, выпрацавалі рад мерапрыемстваў для таго, каб у 1936 годзе дабіцца ўраджайнасці не менш як 18 цэнтнераў па яравых і 16,5 цэнтнераў па азімых з гектара. Гэтага мы дабіемся ва што-б там ні стала.

Самы буйны калгас (344 сям'і) у нашым раёне вельмі пацярпеў у 1933—34 годзе ад польскіх дыверсантаў. Гэты калгас 11 раз гарэў і пацярпеў страт на 150

тыс. рублёў. Але калгаснікі не палі духам. Наш беларускі ўрад шмат дапамог ім, адпусціў лес. І калгаснікі бадзёра і радасна будуюць сваё калгаснае жыццё. Калгас моцны, бо там працуюць пад кіраўніцтвам нашай партыі стойкія большэвікі.

Мы жывем на рубяжы двух светаў.

Я хачу запэўніць сесію ЦВК ад імя ўсіх калгаснікаў Чырвонаслабодскага раёна, што калі вораг захоча перашкодзіць нам у будаўніцтве сацыялізма ў нашай краіне, мы ўсе, як адзін,— будзь гэта на заходняй граніцы, будзь гэта на ўсходняй граніцы, — выступім на абарону нашага вялікага Совецкага Саюза.

Няхай жыве наша комуністычная партыя!

Няхай жыве наш кіраўнік таварыш Сталін!

Прамова тав. К. А. РУБЕНА

СТАРШЫНЯ КАПЫЛЬСКАГА РАЁННАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА

У дакладах старшыні Соўнаркома тав. Галадзеда і яго намесніка тав. Любовіча былі ясна адзначаны тыя велізарнейшыя поспехі, якія дасягнуты нашай ордэнаноснай БССР у 1935 годзе. Гэтыя поспехі дасягнуты былі дзякуючы правільнаму правядзенню генеральнай лініі нашай партыі, дзякуючы мудраму кіраўніцтву нашага вялікага правадыра і настаўніка таварыша **Сталіна. (Апладысменты).**

У нашым пагранічным Капыльскім раёне за мінулы 1935 год мы таксама маем рад несумненных дасягненняў. Так, калгас імя Будзённага дасягнуў ураджаю па ячменю 140 пудоў з гектара, а ў некаторых мясцах нават 160 пудоў з гектара; ільноваллакна 6 цэнтнераў. Такія калгасы не з'яўляюцца адзінкавымі. Іх дзесяткі (калгас імя Свердлова, «Красавік», «Чырвоны сцяг», «8 сакавіка» і інш.).

Чаму яны дасягнулі такога ўраджаю? Іменна таму, што добра вялася падрыхтоўка да веснавой пасеўнай кампаніі. Да сяўбы рыхтаваліся ўсе калгаснікі, скарысталі ўсё неабходнае для таго, каб узняць ураджайнасць глебы. Правільна і добра апрацавалі зямлю. Своечасова і датэрмінова выканалі планы сяўбы, правялі праполку.

Неабходна адзначыць таксама дасягненні, якія ў нас ёсць па жывёлагадоўлі. Некаторыя свінагадоўчыя фермы нашага раёна маюць значныя дасягненні: ферма «Комунар», Вялікараеўскага сельсавета (загадчык фермай Стаскевіч) поўнасцю выканала план па жывёлагадоўлі, датэрмінова выканала план 1935 года па мясапастаўках, выканала 50 проц. плана 1936 г.; прадала 174 галавы пародзістых свіней іншым калгасам і мела чыстага прыбытку каля 40 тысяч рублёў.

Мы таксама маем досыць вялікія дасягненні і ў рабоце нашай МТС. Машынатрактарная станцыя ў 1935 годзе выканала план работ на 111 проц., а лепшы брыгадзір, знатны чалавек, Зоня Рачок выканала план на 168 проц.

Апрача таго, мы ў 1936 годзе атрымаем яшчэ новую МТС.

Значна палепшылася работа нашых сельсветаў.

Чарвякоў. — Як у вас праходзіць справаздачная кампанія?

Рубен. — Справаздачная кампанія советаў па нашаму раёну толькі зараз разгарнулася. На справаздачныя сходы яўка даходзіць да 100 проц. Актыўнасць вялікая. Працуюць масавыя арганізацыі советаў — секцыі і дэпутацкія групы. Мы сельсавет ператварылі ў культурную ўстанову.

Заданні, якія намечаны па нашаму раёну на 1936 год, з'яўляюцца мінімальнымі. Нарады, якія мы правялі з лепшымі людзьмі—стаханаўцамі гавораць за тое, што план 1936 года будзе не толькі выканан, але і перавыканан. Гэтыя нарады гавораць аб тым, што палітычная свядомасць калгаснікаў вырасла, і зараз у нас штодзённа растуць новыя людзі—стаханаўцы.

У нас зараз узмоцнена праводзіцца работа па падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі. Вывозім торф і ўзялі на сябе абавязацельства да 15 лютага поўнасцю выканаць заданні на вывазцы торфу і гною.

Я запэўняю сесію ЦВК ад імя калгаснікаў і чырвоных пагранічнікаў, што пад кіраўніцтвам партыі і ўрада наш пагранічны раён у 1936 годзе дасягне тых перамог і поспехаў, да якіх кліча нас наша партыя і наш урад. **(Апладысменты).**

ПІСЬМЕННІКІ СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Янка КУПАЛА*)

Народны паэт рэспублікі

Даведзенае да крайнасці эксплаатацыяй памешчыкаў і гнётам царызма сялянства на чале з пролетарыятам, як кіраўніком і гегемонам рэволюцыі, выступіла на барацьбу супроць самадзяржаўнапамешчыцкага ладу, супроць цара і памешчыкаў.

І ў гэты перыяд, іменна ў 1905 годзе, прарываецца мастацкі талент песняра народнага гора і мужыцкай нядолі, Янкі Купалы. Ён выступае са сваім першым вершам «Мужык».

Што я мужык, усе тут знаюць,
І як ёсць гэты свет вялік,
З мяне смяюцца, пагарджаюць,
Бо я мужык, дурны мужык.
Што голы я, павінен згінуць,
Як той у лесе чашчавік
І, як сабака, свет пакінуць,
Бо я мужык, дурны мужык.
Але хоць колькі жыць тут буду,
Як будзе век тут мой вялік,
Ніколі, братцы, не забуду,
Што чалавек я, хоць мужык.

Гэтым вершам Купала з самага пачатку паказвае сябе, як паэт, што апявае лёс селяніна, забітага і прыгнечанага ва ўмовах паліцэйска-прыгонніцкай Расіі.

Янка Купала (Іван Дамінікавіч Луцэвіч) нарадзіўся ў 1882 годзе ў сям'і дробнага арандатара Луцэвіча, у фальварку Вязынка, былога Менскага павета.

Янка Купала не толькі бачыў увесь жах жыцця вёскі, забітай, задушанай памешчыцка-паліцэйскім ладам, ён, бадзяючыся па памешчыцкіх маёнтках у пошуках работы, сам перанёс і перажыў пяжкасць памешчыцкага гнёту і кабалы.

Гора і беспрасветная галеча працоўнага беларускага сялянства —вось змест песень Купалы таго перыяда, якімі ён заклікаў і будзіў народныя нізы на барацьбу з ненавіснымі ім памешчыкамі і царскімі апрычнікамі.

У цэлым радзе вершаў Янкі Купалы ва ўсёй выкрываўчай сіле паўстае перад намі жудасць памешчыцка-буржуазнай сістэмы. Пісьменнік паказвае абставіны цяжкай працы селяніна на пана; яго радкі вершаў служаць абвінавачаннем палітыкі гнёту.

Буржуазна-дэмакратычная рэволюцыя ў Расіі разбудзіла нацыянальна-вызваленчы рух у нацыянальна-прыгнечаных народаў за сваё вызваленне з-пад нацыянальнага ўціску. І гэты нацыянальна-вызваленчы рух, нацыянальнае прыгнечанне беларускага народу знаходзілі яркае асвятленне ў мастацкіх вобразах твораў Купалы.

А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агромністай такой грамадзе?
— Беларусы.
А што яны нясуць на худых плячах,
На руках ў крыві, на нагах ў лапцях?
— Сваю крыўду.
А куды-ж нясуць гэту крыўду сваю,
А куды-ж нясуць на паказ сваю?
— На свет цэлы.
А хто гэта іх, не адзін мільён,
Крыўду несць навучыў, разбудзіў іх сон?
— Бяда, гора.
А чаго-ж, чаго захацелася ім,
Пагарджаным век, ім, сляпым, глухім?
— Людзьмі звацца.

Гэты верш Янкі Купалы прыцягнуў да сябе ўвагу вялікага рускага пролетарскага пісьменніка **А. М. Горнага.** А. М. Горкі на прыкладзе гэтага верша, прасякнутага духам народнай творчасці, паказвае ў сваёй нататцы рост маладой літаратуры беларусаў, самага забітага народу царскай Расіі. Ён пераклаў на рускую мову гэты верш, назваўшы яго гімнам.

Нават з гэтага факту відаць, як Алексей Максімавіч яшчэ тады, у гады самадзяржаўнага ладу, зварачаў увагу на развіццё беларускай літаратуры, як і літаратур іншых народаў, знаёміў з ёю рускага чытача. Не хто іншы, як Алексей Максімавіч адкрыў такім чынам рускаму чытачу беларускага паэта Янку Купалу яшчэ ў 1911 г., акрыліў яго, падняў бадзёрасць, дапамог яму.

М. Горкі сваім меткім вокам вялікага пісьменніка ўбачыў у Купалы мастака, творы якога, што надзвычай каштоўна, непарыўна звязаны з народнай творчасцю, жывяцца глыбокімі нізамі шматмільённай вёскі, ён выказваў яе думы і настроі. А ў гэтым сіла твораў, сіла і веліч песень Купалы.

Купала выступае як рэволюцыйна-дэмакратычны раліст, адлюстроўваючы жыццё і барацьбу масы.

Але Купала, які выступіў на першым этапе буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі з агністай нянавісцю супроць памешчыка-эксплаататара, супроць прыгонніцкіх парадкаў, не адолеў быць паслядоўным барацьбітом рэволюцыі, які ясна бачыў яе мэты, задачы, перспектывы і галоўныя рухаючыя сілы.

Янка Купала адлюстроўваў у сваіх творах ідэалогію дробнага таваравытворцы. І само сабою зразумела, дваістая прырода гэтага класа не магла не накласці дваістасці, супярэчлівасці на творы Купалы.

Калі пасля рэволюцыі 1905 года, якая не завяршылася перамогай, насталі гады рэакцыі, Янка Купала ўпадае ў роспач, часамі ў містыку, апыняецца перад ідэйным і творчым тупіком, амаль гасне яго ранейшая сіла, як рэволюцыйнага рэаліста, магутнага песняра барацьбы.

Усё гэта абумовіла тое, што Янка Купала падпаў пад уплыў беларускага буржуазнага нацыяналізма, апынуўся ў палоне буржуазных беларускіх нацыяналістаў, якія зрабілі ўсё магчымае, каб зацягнуць паэта варожым рэволюцыі павуцінням, трымаць яго ў сваіх контррэволюцыйных лапах. Яны зрабілі ўсё, каб падарваць у паэта веру ў сілу масы, той масы, песняром якой з'яўляўся Купала, якая натхняла яго ранейшыя творы рэволюцыйным аптымізмам.

Але тое, што Купалу, як паэта, высунулі нізы шматпакутнага беларускага народу, давала сябе адчуваць. І ў змрочныя гады царскай рэакцыі паэт часамі прарывае гэта нацыяналістычна-містычнае павуцінне і наперакор буржуазным згодніканм падымае свой голас супроць земскага, супроць урадніка, папа, паліцыі, воласці.

Купала заклікае мазольнага хлебароба кінуць выгляд сляз'ілівы:

Гэй, гэй хлебаробе мазольны,
Пан сошкі і коскі і поля,
Кінь выгляд сляз'ілівы, нявольны.
У тваіх руках слава і доля.

Кастрычніцкую сацыялістычную рэволюцыю, грамадзянскую вайну і першы перыяд сацыялістычнага будаўніцтва Янка Купала ацэніў не з пазіцый прыгнечаных раней класаў, з якімі звязан быў Купала і пра нядолю якіх пісаў ён прызыўныя вершы на першым этапе сваёй літаратурнай дзейнасці, а з пазіцый беларускіх контррэволюцыйных нацыянал-дэмакратаў, якім удавалася доўгі час трымаць пісьменніка ў сваіх нацыяналістычных сецях.

Класавы вораг ведае, што мастацкая літаратура — адна з вострых зброй класавай барацьбы. І контррэволюцыйныя беларускія нацдэмы імкнуліся ўсякім чынам, пускаючы ў ход абман, правакатарскія хітрыкі, зладзействы і жульніцтва зацягнуць вялікага паэта Беларусі Янку Купалу ў свой лагер.

Хістанне паэта, якое тлумачылася тым, што ён тады яшчэ не зразумеў сутнасці адбываючыхся падзей, не здолеў даць ім сапраўднай ацэнкі, падпадзенне яго дзякуючы гэтаму на адпаведных этапах пад уплыў нацыяналізма, — усё гэта , акрыляла контррэволюцыянераў.

Перамогі соцыялізма, велізарныя магчымасці для творчай дзейнасці ў краіне Совецкаў, шчырае жаданне працаваць на карысць вызваленага народу, сувязь Купалы з народам, які з велізарным энтузіязмам і натхненнем будуе соцыялістычнае жыццё, які ўсё пясней і пясней згуртоўваецца вакол партыі Леніна і Сталіна, — усё гэта прывяло і, зразумела, не магло не прывесці паэта да рашучага, пвёрдага і канчатковага перамагання сваіх ранейшых памылак.

Купала сумленна і шчыра пайшоў за партыяй большэвікоў, за яе кіраўніцтвам, за партыяй, якая дапамагла яму вызваліцца ад нацыяналістычнай атруты, якою атручвалі яго контррэволюцыйныя нацыяналісты. І дзякуючы партыі, якая так клапатліва і з усёй шчырасцю дапамагала Купалу, пісьменніку адкрылася новая вясна, другая маладосць.

«Сёння Янка Купала,—гаварыў у сваёй гутарцы з пісьменнікамі Беларусі т. Гікало, — гэта не той чалавек, які быў некалькі гадоў таму назад. Для нас Янка Купала, Якуб Колас — неадрыўная частка літаратуры Совецкай Беларусі. А вы думаеце, што толькі з'езд зрабіў іх такімі? Гэта работа партыі ў цэлым і ваша — комуністаў-пісьменнікаў, а таксама воля і жаданне іх саміх перабудавацца, пераглядзець свой палітычны творчы шлях на аснове гістарычнага рашэння нашай партыі аб рабоце пісьменніцкіх арганізацый».

Зноў і па-новаму загучалі песні Купалы, поўныя жыцця, замілавання, юнацкай свежасці, лёгкасці, насычаныя рэволюцыйным пафасам, якім ахоплена краіна соцыялізма. Шмат песень даў Купала, што адлюстроўваюць жыццё новай калгаснай вёскі, песень, што натхняюць будаўнікоў соцыялізма на новыя і новыя перамогі.

Паэма **«Над рэкою Арэсай»** — ёсць апафеоз соцыялістычнай працы, што перамагае ўсе перашкоды і цяжкасці. Паэт ставіцца да гэтай гераічнай барацьбы не як наглядальнік, а з гарачым пачуццём непасрэднага ўдзельніка.

Напоўненыя душэўнай любоўю гучаць песні паэта пра гераізм нашых рабочых, пра нашу слаўную Чырвоную армію. Незабыўныя словы прысвячаюцца паэтам генію чалавецтва вялікаму Сталіну:

...Мы ідзем у сонцы з сонцам
Маладым паходам.
Слава бацькаўшчыне нашай
І яе народам.
Слава сокалу, што родам
З-над каўказскіх скалаў,
Што з Крэмля праменні сее
З юнацкім запалам.

Праўдзіва гаворыць пролетарскі пісьменнік Лахуці пра сённяшняга Янку Купалу:

Сіла ў магутнага льва загуляла.
Болей не ведае мукі і болю,
Болей не плача Янка Купала.
Песня жалобаю больш не ліецца,
Песня па-львіному рыкаць стала,
Ружа яго расцвітае, смяецца,
Што за шчаслівец Янка Купала.

Не «отечество» бізуна, шыбеніц, эксплаатацыі, панавання і перасычэння крывёю і потам рабочых і сялян, а — СССР, соцыялістычная бацькаўшчына сусветнага пролетарыята — радзіма Купалы. Дзякуючы трыумфу ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі ён знайшоў сваю радзіму.

Купала — адзін з лепшых пісьменнікаў, якога любіць народ. Купала паэт Совецкай Беларусі і Совецкага Саюза. А гэта — вынік работы партыі, якая дапамагла яму вызваліцца ад нацыянальнай абмежаванасці, падняцца на высокую ступень пролетарскага інтэрнацыяналізма.

З пачуццём велізарнай радасці Купала апявае ордэнаносную Совецкую Беларусь, якая была прыгнечана пры царызме і якая цяпер квітнее, як краіна перамошага соцыялізма, з'яўляецца несакрушальнай крэпасцю СССР на рубяжы з капіталістычным Захадам.

Бязмежная любоў у беларускага народу да СССР, пры брацкай дапамозе якога Совецкая Беларусь дабілася нечуванага росквіту соцыялістычнай гаспадаркі і нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зместу культуры. І гэта любоў працоўных мас Беларусі да СССР знайшла сваё адлюстраванне ў Купалы, як сына гэтага народу, як сына вялікага СССР, якім з'яўляецца цяпер Купала.

*) З даклада загадчыка аддзела Культасветработы ЦК КП(б)Б т. А. І. Дзякава на ўрачыстым юбілейным сходзе 11 снежня 1935 г., прысвечаным трыццацігоддзю літаратурнай дзейнасці Янкі Купала.

ПЕРАГАВОРЫ У ПАРЫЖЫ

ІНТРЫГІ АЎСТРЫЙСКІХ МАНАРХІСТАЎ

ПАРЫЖ, 6 лютага. Дыпламатычныя перагаворы ў Парыжы сустрэлі нечаканае затруднение ў пытаньні аб аднаўленні ў Аўстрыі манархіі Габсбургаў.

Спачатку аўстрыйскі віцэ-канцлер Штарэмберг даў афіцыяльным прадстаўнікам Францыі запэўненне, што аўстрыйскі ўрад, не адмаўляючыся ў прынцыпе ад аднаўлення манархіі, не пойдзе на гэты крок, пе заручыўшыся папярэдняй згодай дзяржаў, якія ўваходзілі раней у склад аўстра-венгерскай імперыі. Адпал хутка ў гэтым пытанні адбылося кінематаграфічна быстрыя змены.

Нечакана ў Парыж прыбыў сам претэндент на аўстрыйскі престол эрцгерцог Отто Габсбургскі, пражываючы ў ваколіцах Брусселя. Ледзь выйшоўшы з поезда, ён паспяшыў да Штарэмберга. Неўзабаве парыжскім журналістам была перадана заява аўстрыйскага віцэ-канцлера, у якой гаварылася:

«Віцэ-канцлеру прыпісваюць заяву, што аднаўленне манархіі ў Аўстрыі не адбудзецца без папярэдняй згоды Малой Антанты. Штарэмберг нічога падобнага не гаварыў. Вядома, рэстаўрацыя не адбудзецца нечакана, і вялікія дзяржавы будуць аб гэтым паведамлены, бо аўстрыйскі ўрад не мае намеру запаліць пажар у Еўропе».

Па сутнасці справы, Штарэмберг узяў назад сваё абяцанне не аднаўляць манархіі без папярэдняй згоды дзяржаў Малой Антанты.

Цяжка ацэнаваць прадбачыць, які ўплыў аказа гэта скорапаліцельная змена пазіцыі аўстрыйскага ўрада ў пытанні аб аднаўленні манархіі на далейшыя перагаворы аб гарантаванні дзяржавамі аўстрыйскай безапасناсці.

Парыжскія перагаворы далі пакуль найбольш станоўчыя рэзультаты ў галіне ўмацавання **франка-югаслаўскіх** адносін. Афіцыяльныя югаслаўскія прадстаўнікі, як указвае французскі друк, заявілі, што **«Югаславія пры усякіх акалічнасцях пойдзе на што ўгодна, абы Францыя была побач з ёй».**

Франка-румынскія перагаворы таксама далі відомы рэзультат у сэнсе далейшага зближэння Румыніі з Францыяй. Румынскі король у асобай заяве вельмі пёпла адгукнуўся аб міністру замежных спраў Тытулеску, указаўшы, што ён падзяляе палітыку апошняга ў пытанні аб падтрымаці міру на аснове калектыўнай безапасناсці і прынцыпаў Лігі нацый.

Тут зараз абмяркоўваецца пытанне аб **французскай пазіцыі для Румыніі і аб дапамозе з боку французскай прамысловасці снабжэнню румынскай арміі.** Гутарка, у прыватнасці, ідзе аб узмацненні румынскай авіяцыі і матарызаваных часцей.



Італьянскія самалёты бамбардыравалі шведскі шпіталь Чырвонага крыжа каля Дэло (Абісінія). Бамбардыроўкай было забіта 28 хворых і ранена звыш 100. На здымку: транспартаванне раненага супрацоўніка шведскага Чырвонага крыжа пасля бамбардыроўкі Дэло.

Саюзфото.

ПАВЕДАМЛЕННІ АБ ПАСЫЛЦЫ ЯПОНА-МАНЧЖУРСКІХ ВОЙСК К ГРАНІЦАМ МНР

ЛОНДАН, 8 лютага. (БЕЛТА). Дайрэнскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр перадае, спасылаючыся на поўафіцыяльнае паведамленне, што японска-манчжурскія войскі адпраўлены к граніцам Знешняй Манголіі. Лондонскі друк публікуе на відным месцы гэта паведамленне аб руху японска-манчжурскіх войск.

Такія-ж паведамленні распаўсюджваюцца і іншымі еўрапейскімі тэлеграфнымі агенцтвамі.

Абвяржэнне паведамлення агенцтва „Домей цусін"

УЛАН-БАТОР, 8 лютага. (БЕЛТА). У паінфармаваных мангольскіх колах абвяргаюць паведамленне чанчуньскага карэспандэнта японскага тэлеграфнага агенцтва «Домей цусін» аб меўшым нібыта месца нападзе мангольскай пагранічнай аховы на манчжурскі пост Олаходка 5 лютага.

Паводле атрыманых тут праверэных данясенняў з граніцы 4-га і 5-га лютага, ля захвачанай японска-манчжурскімі войскамі 19 снежня мінулага года мангольскай пагранічнай заставы Булун-Дэрсу наглядаўся рух японска-манчжурскіх войск. За 4—5 кілометраў ад заставы ў гэтыя дні з'яўляліся асобныя машыны і групы коннікаў. Ноччу з 4 на 5 лютага з занятай японска-манчжурскімі войскамі заставы быў адкрыт вінтовачны агонь па мангольскай пагранічнай заставе, які аднак, з прычыны дальнасці адлегласці, ніякай шкоды не прычыніў.

Англійская газета аб вымыслах японскага друку

БЕЙПІН, 7 лютага. (БЕЛТА). Выдаваемая ў Цяньцзіне англійская газета «Пекін энд Цяньцзін таймс» у перадавым артыкуле, прысвечаным падзеям на совецка-манчжурскай граніцы, піша: «Характэрна, што падзеі на граніцы супадаюць з разгорнутай прапагандысцкай кампаніяй, якая праводзіцца з Мукдэна, аб так званай комуністычнай пагрозе на поўначы Кітая».

Выкрываючы выдумкі японскага друку аб «прыбыцці ў Цяньцзін чатырох штабных афіцэраў совецкай далёка-ўсходняй арміі для ўстанаўлення совецкага рэжыму на поўначы Кітая», а таксама паведамленне адносна плана арганізацыі «комуністычнага лятучага атрада» з'галоўным штабам у Калгане, газета заяўляе:

«Толькі адзін чалавек на 100 можа паверыць падобным байкам аб комуністычных змовах, астатнія-ж 99 цвёрда пераконаны, што японцы імкнуцца да перавароту ўлады на поўначы Кітая ў мэтах антыкомуністычнага крыжовага паходу. Калі ва ўсіх японскіх паведамленнях замяніць словы «комуніст» і «советы» словам «Манчжоу-Го», то гэтыя паведамленні акажуцца надзвычай падобнымі на агульнавядомыя факты, якія мелі месца на поўначы Кітая».

КОМУНІСТ КЛАМАМЮС—КАНДЫДАТ НАРОДНАГА ФРОНТА НА ВЫБАРАХ У СЕНАТ

ПАРЫЖ, 7 лютага. (БЕЛТА). Нарада прадстаўнікоў партый, якія далучаюцца да народнага фронта, з удзелам сенатараў, выбраных на апошніх выбарах па спісу народнага фронта, аднагалосна рашыла высунуць на маючых быць частковых выбарах у сенат у дэпартаменце Сены кандыдатуру комуніста Кламамюса.

Рашэнне падпісана прадстаўнікамі комуністычнай і соцыялістычнай партый, партыі радыкал-соцыялістаў і інш.

СТАЧКА КРАЎЦОЎ У ВАРШАВЕ

У Варшаве, па паведамленню газеты «Роботнік», звыш двух тыдняў прадаўжаецца забастоўка жаночых краўцоў. Бастуючыя змагаюцца за паляпшэнне ўмоў працы і супроць зніжэння заработнай платы. Частка прадпрыемцаў ужо задаволіла патрабаванні рабочых, і каля 400 чалавек (з 1.600), на падставе рашэння, прынятага бастуючымі, прыступілі да работы.

Большасць-жа рабочых забастоўку прадаўжае пры поўным матэрыяльным і арганізацыйным падтрымані з боку тых краўцоў, якія пачалі працаваць. (ТАСС).

Паведамленне ТАСС

З прычыны спынення меўшых месца на прылягаючай да совецкай граніцы тэрыторыі Манчжоу-Го чумных захворванняў, урад СССР пастанавіў адкрыць граніцу паміж СССР і Манчжоу-Го па рацэ Амуру на ўчастку Кумар-Пашкова.

СПРЭЧКІ

Паміж бялыніцкім і бярэзінскім пракурорамі тт. Нічыпарукам і Вераб'ёвым ішлі вялікія спрэчкі. Яны вяліся на аснове ўсіх апошніх дасягненняў канцэлярскай тэхнікі шляхам надрукаваных на машынцы адносін са штампам і за адпаведным нумарам, з адбіткамі адносін і адбіткамі з адбіткаў.

У 1936 годзе на тэрыторыі Бялыніцкага раёна быў забіт М. І. Альшэўскі — жыхар пас. Журавок, Мачаскага сельсовета, Бярэзінскага раёна. Ён накіроўваўся да сваёй жонкі, якая жыла ў вёсцы Асаўцы, Феліксонаўскага сельсовета, Бялыніцкага раёна і дадому не вярнуўся. Брат забітага ў хуткім часе звярнуўся з заявай у бялыніцкую раённую міліцыю, але не атрымаў ніякіх вынікаў. З гэтай прычыны ён у кастрычніку 1935 года звярнуўся з пісьмом у рэдакцыю «Звязды». Пісьмо гэта было накіравана пракурору Бярэзінскага раёна. Тут, уласна кажучы, і пачынаецца справа.

Бярэзінскі пракурор, атрымаўшы пісьмо, накіроўвае яго пракурору Бялыніцкага раёна. Паколькі забойства адбылося на тэрыторыі гэтага раёна, ды к таму-ж аўтар пісьма скардзіцца на бялыніцкую міліцыю, няхай бялыніцкі пракурор і займаецца ўсім гэтым. Той варочае пісьмо назад, каб, па яго словах, бярэзінскі пракурор дапытаў аўтара пісьма. Але не такі ўжо бярэзінскі пракурор, каб лёгка паддаўся свайму суседу. Ён зноў адсылае матэрыял бялыніцкаму пракурору, той зноў шле назад. Кожны з пракураў піша па адрасу другога злыя і атрутлівыя рэзалюцыі і, нарэшце, абодва зварачаюцца ў «Звязду» і пракуратуру рэспублікі. Абодва лічаць, што даследаваць справу і выявіць злачынцаў з'яўляецца прамым абавязкам другога. Колькі вынаходлівасці праяўляе кожны, каб даказаць, што не ён, а іменна яго калега з'яўляецца самым заядлым бюракратам, што па віне і з прычыны нежадання таго затрымліваецца расследванне. Колькі тонкага і злога гумару, колькі «сапраўднай» пракурорскай настойлівасці!

Пракуроры спрачаюцца, а справа між тым не рушыцца з месца. Злачынцы адчуваюць сябе спакойна. Бюракраты з раённай пракуратуры вядуць працяжныя і ўпартыя спрэчкі, чыім абавязкам з іх з'яўляецца барацьба са злачыннасцю. Даволі сумным у гэтай гісторыі з'яўляецца тое, што трэцім удзельнікам яе ў якасці велічнага і маўклівага назіральніка з'яўляецца пракуратура рэспублікі.

ШКОЛА ІНСТРУКТАРОЎ СТРАЛКОВАЙ СПРАВЫ

ГОМЕЛЬ, 7 лютага. (БЕЛТА). Да гадавіны Чырвонай арміі гомельскі чыгуначны совет Асоавіяхіма арганізуе трохмесячную школу інструктароў стралковай справы. Заняткі будуць праводзіцца без адрыву ад вытворчасці. Вайсковы габінет пры чыгуначным клубе імя Леніна рэарганізуецца ў вайсковы клуб.

НАПЯРЭДАДНІ ПЛЕНУМА ПРАЎЛЕННЯ ССП СССР

У Менск пачалі з'язджацца ўдзельнікі пленума праўлення саюза совецкіх пісьменнікаў СССР. З Узбекістана прыбылі пісьменнікі Гайрацці і Айбек, з Башкірыі — Гумераў і Марат, з Кіргізіі — Такамбаеў, з Арменіі — Саар'ян і Маары, з Паўночнай Асеціі — Мансураў. Атрымана тэлеграма ад старшыні праўлення саюза совецкіх пісьменнікаў УССР тав. Сенчэнка аб тым, што украінская дэлегацыя выехала 8 лютага з Кіева ў Менск.

***

Для сустрэчы маскоўскіх пісьменнікаў, прыбываючых у Менск спецыяльным цягнікам 10 лютага, выдзелена дэлегацыя саюза совецкіх пісьменнікаў БССР у складзе народных паэтаў рэспублікі Янкі Купалы і Якуба Коласа, тт. Клімковіча, Александровіча, Чарота, Лынькова, Хадыка, Бранштэйна, Броўкі, Кучара, Бядулі, Галавача, Чорнага, Кавальскага, Зарэцкага, Глебка, Вольнага, Каповіча і інш.

***

Для абслугоўвання ўдзельнікаў пленума ў распараджэнне арганізацыйнай камісіі перадана 35 легкавых аўтамашын. Дэлегаты будуць размешчаны ў гасцініцах «Еўропа» і 2-й Совецкай. Да кожнай дэлегацыі прымацаваны беларускія совецкія пісьменнікі.

ТЭЛЕГРАМА ТАВ. ЛАХУЦІ ПІСЬМЕННІКАМ БССР

У адказ на прывітанне пісьменнікаў БССР нядаўна ўзнагароджаны ордэнам Леніна таджыкістанскі совецкі паэт Гасем Лахуці прыслаў на імя тав. Клімковіча наступную тэлеграму: «Прашу перадаць усім таварышам, разам з вамі віншаваўшым мяне: агонь вашага брацкага прывітання запаліў у маёй крыві пыл маладосці. Вы назвалі мяне другам беларускага народу. Ганаруся быць другам народу, вядучага побач з сабой па ленінскаму шляху сваіх братоў з іншых нацыянальнасцей. Прывітанне рознамоўнай, але аднадушнай сям'і народаў Сопыялістычнай Беларусі. Прывітанне і падзяка яе песнярам. **Лахуці».**

ТЭЛЕФОННАЯ СУВЯЗЬ ЛЕНІНГРАД — КІЕЎ

На тэрыторыі БССР закончана пабудова новай тэлефоннай лініі Ленінград—Кіеў праз БССР. Правады падвешаны на адлегласці каля 1.000 кілометраў. Гэтым самым Ленінград атрымлівае магчымасць непасрэднай тэлефоннай сувязі з Кіевам, якая дагэтуль ажыццяўлялася вакольным шляхам праз Маскву. Адначасова значна паляпшаецца тэлефонная сувязь паміж Менскам і Ленінградам, асабліва па чутнасці. Лінія ўступіць у эксплаатацыю ў лютым.

АДПАЧЫНАК СТАХАНАЎЦАЎ ЛЯСНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

РЭЧЫЦА, 8 лютага. (БЕЛТА). У чыстым і ўтульным прафілакторыі Бабіцкага механізаванага лесаўчастка на працягу 30 дзён без адрыву ад вытворчасці адпачывалі лепшыя людзі — стахановцы ўчастка: трактарыст Гусакоў, возчык Лобан, брыгадзір грузчыкаў Блінаў, лесарубы-калгаснікі Астапенка, Кулага, Шпадарук і інш. У часе адпачынку яны прыбавіліся ў вазе ад 3,5 да 8 кілограмаў. Стахановцы засталіся вельмі задаволенымі прафілакторыем.



У г. Жлобіне арганізавана дзіцячая тэхнічная станцыя, дзе займаюцца каля 40 дзяцей у розных гуртках: аўтаконструктарскім, авіямадэльным, фотогуртку і гуртку рукадзелля. Да раённай канферэнцыі комсамола дзеці-гурткоўцы арганізавалі выстаўку работ дзіцячай станцыі.

На здымку: дзеці-піянеркі Купленкова Тамара, Пранаева Клара і Мацюшына Окцябрына разглядваюць вышываную карціну «Пляскі».

Фото Я. Салавейчыка.

Насустрач 18-й гадавіне Чырвонай арміі

Цэнтральны совет Асоавіяхіма СССР за ўзорнае правядзенне перапіку членаў Асоавіяхіма і добрую пастаноўку абарончай работы занёс на ўсесаюзную дошку гонару імя X з'езда ВЛКСМ асоавіяхімаўскую арганізацыю менскага завода імя Кірава. Да 18-й гадавіны Чырвонай арміі на заводзе па агульных сходах рабочых асоавіяхімаўцам будуць уручаны членскія білеты. Да гэтага дня 200 чал. здадуць нормы на значок «Гатоў да супрацьпаветранай і хімічнай абароны», 15 чал.—на значок «Гатоў да санітарнай абароны». Будзе падрыхтавана 50 варашылаўскіх стралкоў. 19 лютага па цэхах адбудзецца масавая чытка мастацкай літаратуры аб Чырвонай арміі. 20 лютага будзе праведзен палітдзень на тэму: «18 год РСЧА». У дзень свята 23 лютага адбудзецца агульназаводскі вечар, на які будуць запрошаны чырвонаармейцы падшэфнай часці.

НОВЫЯ ФІЛЬМЫ БЕЛАРУСКАЙ СОВЕЦКАЙ КІНЕМАТАГРАФІІ

Дырэктар кінофабрыкі «Совецкая Беларусь» Белдзяржкіно тав. Матусаў паведамляе супрацоўніку «Звязды» аб новых фільмах, над якімі будзе працаваць фабрыка ў бягучым годзе.

У план работы на 1936 год уключана пастаноўка раду новых гукавых мастацкіх фільмаў. Усяго выпускаецца 7 карцін. У красавіку заканчваюцца дзве карціны: «Шукальнікі шчасця» — аб Біра-Біджане, па сцэнарыю заслужанага дзеяча мастацтва Кобеца і Зэльцера, у пастаноўцы заслужанага дзеяча мастацтва рэжысера Корша, і «Дзяўчынка спяшыць на спатканне» па сцэнарыю А. Зорыча, у пастаноўцы рэжысера Вернера. У чэрвені будзе закончаны дзіцячы фільм «Канцэрт Бетховена» аб юных дараваннях (сцэнары Пхора, рэжысеры Шмітгоф і Гавронскі). У сакавіку пачынаецца з'ёмка карцін «Дняпро ў агні» (сцэнары Барашка і Кобеца, рэжысеры Сабінскі і Навроцкі) і «Салавей» па аднаіменнаму твору Вядулі. Пачнецца таксама з'ёмка фільму «Балтыйцы» — аб гераічнай барацьбе балтыйскіх маракоў з інтэрвентамі ў 1919 годзе (сцэнары А. Зіноўева і Штэйна, пастаноўшчык—заслужаны артыст рэспублікі Файнцымер).

Ленінградскі пісьменнік Карнілаў напісаў для фабрыкі сцэнары для дзіцячага фільму «Школа і спорт». Заслужаны дзеяч мастацтва рэжысер Тарыч разам з групай аўтараў прыступілі да работы над пастаноўкай вялікай карціны аб гісторыі грамадзянскай вайны на Беларусі. Аўтары сцэнарыя — пісьменнікі А. Талстой, Кобец, Лынькоў, Вольны і Недобрава.

ЗАЗЕЛЯНЕЛІ АГУРКІ І ЦЫБУЛЯ

У прыгарадных гаспадарках Менска пачалася закладка парніковых рам і засеў гароднінай у цяплицах. У калгасе «Чырвоны транспартнік» ужо закладзена 100 рам з радыскай і салатай. У цяплицы ўзышла цыбуля і агуркі. Гаспадарка ў студзені прадала 140 кілограмаў свежай цыбулі.

Таксама распачалі закладку парнікоў калгасы. Калгас «Чырвоны агародник» (Менчына) заклаў больш 100 рам. Сёлета калгасамі БССР будзе закладзена 107 тыс. парніковых рам — на 42 тыс. больш, чым у мінулым годзе. Летась па ўсіх калгасах БССР цяплицы займалі ўсяго 2.800 квадратовых метраў плошчы. Сёлета толькі ў Менскім раёне яны займуць плошчу ў 2.500 квадратовых метраў, у Гомельскім — 2.500, у Віцебскім — 5 тыс. квадратовых метраў. У парніках і цяплицах будзе праведзена не менш 2—3 рамазваротаў. (БЕЛТА).

ЗЕЛЕНАДОЛЬСК — МЕНСК НА ЛЫЖАХ

18 студзеня 10 рабочых-фізкультурнікаў зеленадольскіх фанерных заводаў № 3 і 10 (Татарыя) выйшлі ў ваеніізаваны лыжны пераход імя X з'езда ВЛКСМ. Маршрут пераходу Зеленадольск — Канаш — Сергач — Арзамас — Мурам — Масква — Мажайск — Смаленск — Орша — Барысаў — Менск мае працяжэнне 1.700 кілометраў. Усе ўдзельнікі пераходу — стахановцы, з іх 2 спачуваючых і 7 комсамольцаў. 2 лютага ўдзельнікі пераходу прыбылі ў Маскву і былі прынятыя сакратаром ВЦСПС тав. Палонскім. У Менск каманда павінна прыбыць 18 лютага. Фізкультурнікі фанерных і запалжавай прамысловасці БССР рыхтуюць удзельнікам пераходу таварыскую сустрэчу.

УСЕБЕЛАРУСКІЯ КАЛГАСНЫЯ ЛЫЖНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ

У Віцебску закончыліся ўсебеларускія калгасныя лыжныя спаборніцтвы. Перамогу на 20 кілометраў атрымаў калгаснік сельгасарцелі імя Карла Маркса, Клімавіцкага раёна, тав. Пусенкоў. 5-кілометровую дыстанцыю выйграла, калгасніца сельгасарцелі «Першае мая», Віцебскага раёна, т. Стасеева. Камандное першынства заваявалі калгаснікі Віцебскага раёна, другое месца заняла каманда Аршанскага раёна і трэцяе — Менскага. На ўсесаюзныя калгасныя лыжныя спаборніцтвы, якія адбудуцца 15 лютага ў Варонежы, паедуць калгаснікі тт. Крываносаў (Крычаў), Кулік і Шот (Дзяржынск) і калгасніцы Какора (Клімавічы) і Стасеева (Віцебск).

БЕЗ ТАЛОНАЎ

З учарашняга дня менская швейная фабрыка «КІМ» пачала прыём індывідуальных заказаў на пашыў вопраткі без талонаў. Штодзенна будзе прымацца 70 заказаў. На фабрыцы ёсць вялікі выбар каверкота, бастона, драпу, шоўку і іншых матэрыялаў. Тэрмін выканання заказу — 25 дзён.

ПАПРАЎКА

У пастанове Совета Народных Камісараў БССР і Цэнтральнага Камітэта КП(б)Б «Аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў і ўзняцці сельскай гаспадаркі БССР», надрукаванай у «Звязде» ад 8 лютага, у табліцы аб заданні па браніроўцы насенніку шматгадовых траў і пасеваў лубіну 33 радок трэба чытаць так:

«Асіпавіцкі раён . . . 600, 350, 600, 880, 180.

У гэтай-жа табліцы ў апошнім радку трэба чытаць: усяго . . . 65.000 і т. д.

У табліцы аб снабжэнні сельскагаспадарчымі машынамі 74 радок трэба чытаць: Ельская . . . 6; 2; —; —; 2; —; 2; —.

У табліцы аб снабжэнні меліяратыўным інвентаром 54 радок трэба чытаць: Прапойская . . . 2; —; —; —; 2.

ПАВЕДАМЛЕННІ

9 лютага 1936 года ў памяшканні клуба працаўсветы ў 7 гадзін вечара адбудзецца сход комуністаў-адзіночак Варашылаўскага раёна.

Оргбюро Варашылаўскага горрайкома КП(б)Б.

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІК.

Гукавы кінотэатр „Чырвоная зорка" — Гукавы мастацкі фільм ПАДРУГІ

Гукавы кінотэатр „ПРОЛЕТАРЫЙ" — Гукавы мастацкі фільм „Великий утешитель"

Звыш праграмы ЭКСТРАНЫ ВЫПУСК „Да падзей ў Абісініі" № 2

Гукавы кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» — Гукавы амерык. фільм ЗДРАДНІЦТВА Марвіна Блейка

Кіно «СПАРТАК» — Выдатны мастацкі фільм ПАЭТ І ЦАР

НАРКАМУНУТГАНДАЛЬ БССР

СПЕЦЫЯЛІЗАВАНЫ МАГАЗІН ГАЛАЎНЫХ УБОРАЎ

МЕНПРОМГАНДЛЯ

Совецкая, 53

ЗАУСЕДЫ МАЕ У ВЯЛІКІМ ВЫБАРЫ

мужчынскія, дамскія, і дзіцячыя галаўныя ўборы фабрык СССР і БССР

Магазін адкрыт з 10 гадзін раніцы да 7 гадзін вечара.

Дырэкцыя.

ДА УВАГІ ПАКУПНІКОЎ!

МЕНСКІЯ МАГАЗІНЫ МЕНПРОМГАНДЛЯ

МАЮЦЬ ЗАЎСЕДЫ У ПРОДАЖЫ Ў РОЗНАСТАЙНЫМ АСАРТЫМЕНЦЕ НАСТУПНЫЯ ТАВАРЫ:

розную ГАЛАНТАРЭЮ, ТРЫКАТАЖ, ПАРФУМЕРЫЮ, ТУАЛЕТНАЕ МЫЛА, МЫЛА ГАСПАДАРЧАЕ, ШПАЛЕРЫ, ЛАКАФАРБЫ, БУДМАТЭРЫЯЛЫ, ПАСУДУ, ГАСПАДАРЧЫЯ ТАВАРЫ, ДЗІЦЯЧЫЯ ЦАЦКІ, розны ДЗІЦЯЧЫ асартымент тавараў, ФУТРЫ І ФУТРОВАЕ ГАТОВАЕ АДЗЕННЕ, ДАМСКІЯ, МУЖЧЫНСКІЯ І ДЗІЦЯЧЫЯ ГАЛАЎНЫЯ ЎБОРЫ.

ГЭТЫЯ ТАВАРЫ ЗАЎСЕДЫ ЗНОЙДЗЕЦЕ Ў НАСТУПНЫХ НАШЫХ МАГАЗІНАХ:

Дзіцячы ўнівермаг магазін № 1—Ленінская, 1/9, тэл. 25-774.
Галантарэйна - трыкатажны магазін № 2—Ленінская, 10.
Універмаг № 3, Ленінская 9/2, тэл. 22-421.
Універмаг № 17, Ленінская вул., тэл. 21-627.
Галантарэйна - трыкатажны і парфумерны магазін № 30, Совецкая, 83, тэл. 20-764.
Галантарэйна - трыкатажны і парфумерны магазін № 37, Ленінская, 17.
Галантарэйна - трыкатажны і парфумерны магазін № 38, Ленінская, 14.
Галантарэйна - трыкатажны і парфумерны магазін № 44, Ленінская, 22.
Футровы магазін № 7, Ленінская, 12.
Футровы магазін № 18, Ленінская, 1, тэл. 22-068.
Магазіны галаўных убораў № 31, Совецкая, 53.
Магазін галаўных убораў № 39, Ленінская, 9/2.
Спецыялізаваны парфумерны магазін № 23, Совецкая, 62.
Пасудна-гаспадарчы, лакафарбавы магазін № 15, рог вул. Дз. Беднага і пл. Волі, тэл. 25-850.
Пасудна-гаспадарчы магазін № 19, Комсамольская, 3.
Лака-фарбавы, шпалерны і пасудны магазін № 41, Ніжні рынак, 47.
Магазін № 16 Будматэрыялаў, пл. Волі, тэл. 25-155.
Шорны магазін № 25—Чэрвенскі рынак.
Шорны магазін № 47—Конскі рынак.
Шорны магазін—Крыты рынак.

Магазіны гандлююць з 10 гадзін раніцы да 7 гадзін веч.

УЗОРНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ ТАВАР ПА ЖАДАННЮ ПАКУПНІКОЎ ДАСТАЎЛЯЕЦЦА НА ДОМ

ДЫРЭКЦЫЯ.

МЕНГОРКАМСОД

склікае 10 лютага 1936 г., роўна ў 7 гадзін вечара, у клубе імя СТАЛІНА

АГУЛЬНАГАРАДСКУЮ КАНФЕРЭНЦЫЮ

СТАРШЫНЬ КАМСОДАЎ, УПАЎНАВАЖАНЫХ І ЗБОРШЧЫКАЎ ПА КАЛЕКТЫЎНАМУ СТРАХАВАННЮ ЖЫЦЦЯ І РУХОМАЙ МАЕМАСЦІ

Да наступнай павесткай дня:

1) Даклад аб становішчы і перабудове работы на калектыўнаму страхаванню жыцця, вынікі выканання гадавога плана 1935 г. і далейшыя задачы камсодаў і зборшчыкаў на 1936 г. і судаклады старшынь камсодаў.
2) Прэміраванне лепшых зборшчыкаў і актывістаў.
3) Інструктаж камсодаў і зборшчыкаў аб парадку афармлення страхавання і пастаноўкі ўчоту ў калектывах.

Старшыням камсодаў забяспечыць яўку страхавога актыва.

Пасля канферэнцыі — мастацкая частка.

МЕНГОРКАМСОД.

ДА НАШЫХ ПАКУПНІКОЎ

Для ўста наўлення непасрэднай сувязі паміж работнікамі прылаўка і пакупнікамі, з мэтай удзелу іх у паляпшэнні пастаноўкі работы ў аддзелах універмага, дырэкцыя менскага дзяржаўнага універмага скліка е

КАНФЕРЭНЦЫЮ ПАКУПНІКОЎ

сумесна з работнікамі універмага

11 лютага 1936 г., у 7 гадзін вечара, у клубе Дзяржгандля (Комуністычная і рог вуліцы Эн гельса).

Парадак работы канферэнцыі:

1. Як будзе працаваць універмаг у 1936 годзе (даклад дырэктара).
2. Выступленні пакупнікоў на тэмы:
а) ці гандлюе універмаг добраякаснымі таварамі;
б) ці задавальняе яго асартымент тавараў;
в) як абслугоўваюць прадаўцы;
г) ці задавальняе паста ноўка інфармацыі аб наяўнасці тавараў;
д) прапановы пакупнікоў.

Па сканчэнні канферэнцыі — мастацкая частка.

УВАХОД ВОЛЬНЫ.

ДЫРЭКЦЫЯ УНІВЕРМАГА.

ВЫДАВЕЦТВА «ЗВЯЗДА»
Менск, Совецкая, 63
Тэлефоны:
Заг. выдавецтва — 21-358
Бухгалтэрыя — 21-845
Масава-тыражны — 21-360
Прыём аб'яў — 21-845

Уп. Галоўлітбела № Г—4651.

Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63.

Тыраж 104.025